ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СУБОТА, 16 ЛІПЕНЯ 1938 г. № 39 (381)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Управлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ЛІКВІДАВАЦЬ ВЫНІКІ ШКОДНІЦТВА Ў ЛІТАРАТУРЫ

Ярка расквітнела літаратура і мастацтва народаў Совецкай Беларусі, нацыянальныя па форме, соцыялістычныя па зместу. Маладая совецкая беларуская літаратура расла і мужчела ў барацьбе з ворагамі народа—трацкісцка-бухарынскай поганню і іншымі нацыянал-фашысцкімі бандамі, якія арудвалі ў БССР і ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР. Бяспрэчна, што поспехі беларускай літаратуры былі-б значна большымі, калі-б не ворагі, якія былі акапаліся на фронце літаратуры і мастацтва і, замаскіраваўшыся і двурушнічаючы тварылі тут свае агідныя справы.

Аб гэтым красамоўна сведчыць той факт, што нядаўна органамі НКВД выкрыт мацёры шпіён, натхніцель усяго нацыянал-фашысцкага зброду, арудаваўшага ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР.

Бяздарны вершаплёт, тарабаршчык: алілуйшчык, які пачаў сваю «дзейнасць» з одаў кату Пілсудскаму, дакаціўся да лагера бандытаў з гестапо. Гэта ён па заданню заклятых ворагаў народа пісаў гнусныя пасквілі на соцыялістычны лад, аплёўваў беларускі народ і яго праўду. Уцёршыся ў рады совецкіх пісьменнікаў, гэты гад быў прабраўся на кіруючую пасаду ў праўленне ССПБ, дзе пладзіў падхалімства, склокі, маскіраваўся, шкодзіў літаратуры, як толькі мог.

Пісьменніцкая грамадскасць была выкінула яго з сваіх радоў, але каварны і хітры вораг здолеў зноў улезці ў рады пісьменнікаў. Партыйная арганізацыя, выключыўшы яго з радоў КП(б)Б, як двурушніка і ворага, не здолела да канца адстаяць зусім правільнае сваё рашэнне. Праўленне ССПБ на чале з тав. Лыньковым займала гніла-ліберальную пазіцыю к заклятаму ворагу.

Выкрыццё мацёрага бандыта пяра, заклятага ворага беларускага народа ў літаратуры — трывожны сігнал. Гэты сігнал лішні раз сцвярджае аб тым, што ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў прытуплена большэвіцкая пільнасць, што тут не ўсё ў парадку. Аб гэтым яскрава сведчаць і факты аб былой дзейнасці ворагаў у яўрэйскай секцыі паэтаў і пісьменнікаў. Да сігналаў паэтаў і пісьменнікаў, да сігналаў пісьменніцкай грамадскасці праўленне ССПБ амаль не прыслухоўваецца.

За апошні час праўленне ССПБ фактычна не працуе. Галоўнае, чым яно павінна займацца, — рукапіс пісьменніка, — не ў пашане, ні адзін твор у рукапісу не абмяркоўваўся. Ні раман Э. Самуйлёнка «Будучыня», ні новая паэма П. Броўкі «Кацярына» на праўленні не разглядаліся, не абмяркоўваліся пісьменніцкай грамадскасцю. Праўленне не ставіла творчых пытанняў, не праводзіла дыспутаў і творчых вечароў.

За апошні час спыніла сваю работу паэтычная секцыя, якою кіруе тав. Броўка. Не працуе секцыя драматургаў, узначальваемая тав. Чорным. Не праводзіць сваіх пасяджэнняў секцыя дзіцячай літаратуры (тав. Якімовіч), а секцыя празаікаў зусім не прыступала да работы.

Бюро секцыі крытыкаў, у якое ўваходзяць тт. Клімковіч, Вольскі і Кучар, не збіралася ад самай зімы. У друку няма крытычных артыкулаў, якія дапамагалі-б пісьменнікам у іх рабоце. Наогул крытычная секцыя з'яўляецца пасіўным сузіральнікам з'яў, якія адбываюцца ў літаратуры. І не дзіва, што настаўнікі, выкладчыкі беларускай літаратуры часта закідваюць Дом пісьменніка запытаннямі і скаргамі на адсутнасць у іх патрэбнага матэрыялу для выкладання беларускай літаратуры. Напісаны тт. Вольскім і Кучарам нарыс «XX год беларускай совецкай літаратуры» задаволіць іх не можа, бо гэты хранікальны і павярхоўны артыкул не дае правільнага ўяўлення аб беларускай літаратуры і грашыць памылкамі. Па віне праўлення ССПБ і яго кіраўніка тав. Лынькова гэты артыкул не абмяркоўваўся пісьменніцкай грамадскасцю.

Паасобныя так-званыя «вядучыя» крытыкі, якія на ўвесь голас крычаць пра недахопы беларускай літаратуры на сходах, за год не напісалі ні аднаго крытычнага артыкула, які-б дапамагаў росту маладых пісьменнікаў і рабоце выкладчыкаў беларускай літаратуры. Такія збураючыя адносіны крытыкаў да сваіх прамых абавязкаў можна вытлумачыць толькі адсутнасцю большэвіцкай адказнасці за лёс беларускай літаратуры.

Такая важная секцыя, як абаронная, чамусьці зусім выпала з поля зроку праўлення ССПБ.

У пачатку гэтага года ў кандыдаты і члены ССПБ прынята здольная моладзь (тт. Кандраценя, Панчанка, Калачынскі, Краўчанка і інш.). Але праўленне бюракратычна аднеслася да іх росту. Прыняўшы ў Саюз маладых пісьменнікаў, яно палічыла на гэтым сваю місію скончанай. Як яны працуюць, над чым працуюць і якую патрэбна аказаць ім дапамогу — ніхто не ведае і не цікавіцца. Далейшае вывучэнне здольнай моладзі перадаручана габінету пачынаючага аўтара, які мала дапамагае ім у рабоце.

У гэтым годзе, у сакавіку, быў праведзен пашыраны пленум ССПБ. Ад гэтага пленума паэты і пісьменнікі чакалі канкрэтнага і дзелавога вырашэння актуальных пытанняў літаратуры, наладжвання работы Саюза совецкіх пісьменнікаў, стварэння сапраўднай творчай атмасферы. Здавалася-б, што, нарэшце, будзе прызнана каштоўнасць рукапісаў, створана павага да яго, як да асноўнага, што вызначае работу пісьменніка. Але ў рабоце пленума пераважалі элементы парадпасці і дэкларацыйнасці. Гаварылі тут багата. Пісьменнікі ўнеслі шмат карысных прапаноў па наладжванню работы ССПБ. Аднак, кіраўніцтва ССПБ засталося глухім да прапаноў пісьменнікаў і нічога не зрабіла па іх рэалізацыі.

Даўно варта было-б паставіць пытанне пра якасць літаратурнага матэрыялу. На старонках газет і журналаў часамі друкуюцца нізкаякасныя творы — без пачуцця і цеплыні, сухія, напісаныя суконнай мовай. Час спыніць бракаробства і халтуру. У большэвіцкай прэсе павінны друкавацца толькі такія творы, якія авеяны цеплынёй вялікага пачуцця да сваёй радзімы, шчырасцю і задушэўнасцю, свежасцю і маляўнічасцю фарбаў. Хто-ж павінен займацца пытаннем якасці мастацкай літаратуры, калі не праўленне ССПБ. Але ні разу, ні на адным пасяджэнні праўленне аб якасці літаратуры не абмовілася ні словам.

Не адчуваецца кіраўніцтва партыйнай арганізацыі ССПБ літаратурным фронтам. Партыйная арганізацыя ССПБ стаіць у баку ад важнейшых літаратурных пытанняў. Адсутнічае палітыка-масавая работа сярод пісьменнікаў. Пры Доме пісьменніка не працуе ні адзін гуртох, клуб Дома пісьменніка не работае. Затое становішча, якое стварылася ў ССПБ, павінна адказваць у першую чаргу партыйная арганізацыя. Бо каб працавала партарганізацыя, каб комуністы і комсамольцы не былі палітычна блізарукімі і бяспечнымі, ворагі, выкрытыя органамі НКВД нядаўна, былі-б выкрыты даўно і даўно выгнаны з літаратуры.

Дрэнна кіруе партарганізацыя комсамолам ССПБ. Партарганізацыя безадказна ставілася да падбору кіраўнікоў палітвучобы комсамольцаў. Гэтыя «кіраўнікі» адзін за другім выкрываліся, як ворагі народа. На працягу апошніх трох месяцаў комсамольская арганізацыя не працуе, не склікае сваіх сходаў не праводзіць палітзаняткаў.

Адсутнасць большэвіцкай самакрытыкі і рэшткі сямейнасці і групаўшчыны, якія існуюць у ССПБ па сёнешні дзень, прыводзяць да таго, што часам творы паасобных пісьменнікаў, без папярэдняга азнаямлення, залічваюцца авансам у бліскучыя дасягненні, не гледзячы на сваю нізкую якасць. Творы-ж людзей без літаратурных імён, нават выдатныя, часта лічацца слабымі, з радам недахопаў. І не дзіва, што ўсё гэта стварае нездаровую атмасферу, беспрынцыповую густаўшчыну, сее антаганізм паміж пісьменнікамі і нездаволенасць.

Газета «Літаратура і Мастацтва» недастаткова вяла барацьбу за ачыстку літаратурнага фронта ад класава-варожых элементаў. Часам правільна ўзнімаючы актуальныя пытанні літаратуры і мастацтва, газета не заўсёды даводзіла іх вырашэнне да канца.

Партыйная арганізацыя і праўленне ССПБ, уся пісьменніцкая грамадскасць, кіруючыся ўказаннямі партыі і правадыра народаў таварыша Сталіна, павінны ўзняць рэволюцыйную пільнасць і непрымірымасць да ворагаў народа любой масці і колеру, па-большэвіцку ўзяцца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва і выкарчоўванне варожага ахвосця ў літаратуры, паставіць у цэнтр сваёй работы клапатлівае вырошчванне маладых здольных кадраў і наладжванне творчай работы ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў.

Беларуская літаратура вырасла, акрэпла. Народ патрабуе ад сваёй літаратуры якасці, выключнай якасці, прастаты і задушэўнасці, глыбокага ведання жыцця, цеплыні і шчырасці пачуцця, эмацыянальнасці і праўдзівасці ў паказе вобразаў герояў соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя патрабаванні законныя. Беларускія пісьменнікі і паэты, верныя патрыёты сваёй радзімы, адданыя сыны свайго народа прыкладаюць усе свае сілы, каб апраўдаць вялікія надзеі совецкага народа, стварыць неўміручыя вобразы герояў сталінскай эпохі. Гэтую работу трэба ўзначаліць партыйнай арганізацыі і кіраўніцтву ССПБ, дабіцца такіх поспехаў беларускай літаратуры, якіх патрабуе народ, якіх патрабуе вялікі правадыр народаў таварыш Сталін.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

НАША РАБОТА Ў БРАТНЯЙ РЭСПУБЛІЦЫ

У Менску быў на гастролях Одэскі украінскі дзяржаўны тэатр Рэволюцыі, які паставіў рад п'ес — «Праўду», «Гонар», «Простую дзяўчыну», «Отэлло», «Сарачынскі кірмаш» і інш. Калектыў ганарыцца тым, што ў яго рэпертуары ёсць выдатнейшы спектакль «Праўда», А. Карнейчука, у якім зроблена спроба паказаць вобраз генія чалавецтва В. І. Леніна.

Тэатр быў ужо на гастролях у Гомелі і Бабруйску. Калектыў тэатра вельмі здаволены той цёплай сустрэчай, якая была яму аказана ў БССР, у прыватнасці ў Менску, як з боку працоўных, так і з боку гледача, прысутнічаўшага на спектаклях.

Сярод работнікаў тэатра ёсць члены партыі, кандыдаты, спачуваючыя і комсамольцы. Задачай тэатральнага калектыва, усіх яго партыйных і непартыйных большэвікоў з'яўлялася: увязаць сваю работу ў часе гастролей па БССР з усёй грамадска-палітычнай работай, праводзімай на месцах, актыўна ўдзельнічаць у грамадска-палітычным жыцці краіны, паказаць працоўным Совецкай Беларусі дасягненні мастацтва украінскага народа. Нам здаецца, што калектыў тэатра з гэтай работай у асноўным справіўся.

У часе работы ў Гомелі і Бабруйску было зроблена пяць выездаў тэатральнага калектыва ў лагеры, на выбарчыя ўчасткі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР, дзе дадзена пяць канцэртаў для байцоў нашай гераічнай Чырвонай Арміі.

26 чэрвеня работнікі калектыва тэатра абслужылі 7 выбарчых участкаў у сталіцы БССР. Акрамя гэтага, было дадзена два бясплатных канцэрты ў парку імя М. Горкага.

Знаходзячыся ў Гомелі, Бабруйску і Менску, калектыў тэатра зрабіў некалькі экскурсій, пазнаёміўся з ростам беларускай соцыялістычнай культуры і навукі і вельмі здаволены велізарнейшым ростам культуры братняй рэспублікі. Калектыў тэатра накіраваў ужо аб гэтым рад артыкулаў у друк Совецкай Украіны і, вярнуўшыся на радзіму, раскажа працоўным Украіны аб шчаслівым жыцці беларускага народа, дасягнутага ім пад кіраўніцтвам слаўнай комуністычнай партыі і вялікага Сталіна.

Калектыў тэатра ганарыцца тым, што ён удзельнічаў у падрыхтоўчай кампаніі да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, а ў дзень выбараў Вярхоўнага Совета выканаў свой высокі грамадзянскі доўг у братняй рэспубліцы, аддаўшы свае галасы, як і ўсе працоўныя, за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Калектыў шчаслівы тым, што ён галасаваў за саратніка вялікага Сталіна, першага маршала Чырвонай Арміі рабочых і сялян таварыша К. Е. Варашылава, які балатыраваўся па Молатаўскай выбарчай акрузе ў сталіцы БССР — гор. Менску.

Калектыў з вялікім захапленнем адгукнуўся на пастанову ўрада СССР аб выпуску Пазыкі трэцяй пяцігодкі (выпуску першага года) і актыўна ўключыўся ў рэалізацыю яе. Падпіскай ахоплены ўсе 100 процантаў супрацоўнікаў калектыва тэатра. Работнікі калектыва выклікалі на спаборніцтва па рэалізацыі пазыкі Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр, які знаходзіцца на гастролях на Украіне.

Партыйныя і непартыйныя большэвікі Одэскага украінскага тэатра, натхнёныя поспехам спектакляў, якія ставіліся ў БССР, мабілізуюць усе свае сілы і веды на хутчэйшую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва і на тое, каб яшчэ лепш працаваць на фронце мастацтваў.

Калектыў тэатра ўсхваляван аказанай яму цёплай сустрэчай і вельмі добрымі адносінамі да яго ў часе яго знаходжання на гастролях у Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы. У яго застануцца самыя лепшыя ўражанні аб працоўных БССР, аб росквіце іх культуры і навукі, аб умацаванні фарпоста вялікага Совецкага Саюза на Захадзе.

Д. І. КРУГМАН,
сакратар парткамітэта Одэскага тэатра Рэволюцыі.

КОМСАМОЛ У ТЭАТРЫ

У старым ТЮЗ'е комсамольцаў у тэатры было вельмі мала. Ды гэта і не дзіва. Арудаваўшым у тэатры ворагам і іх пасобнікам, відаць, не да спадобы быў комсамол. Трапіўшыя ў тэатр комсамольцы «прыбіраліся» к рукам альбо па той ці іншай прычыне выкурваліся адтуль.

Цяперашні Тэатр юнага гледача ў сваім творчым складзе мае 50 процантаў комсамольцаў. Як-жа комсамольцы Тэатра юнага гледача спраўляюцца з сваімі задачамі?

У дні выбараў у Вярхоўны Совет БССР комсамольская арганізацыя і ўвесь калектыў тэатра жылі поўнакроўным палітычным жыццём. Ні адзін комсамолец не быў у баку ад гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Кожны з гонарам выконваў свае даручэнні, дзе-б ён ні быў: на сцэне, на ўчастку, у палітгуртку і г. д.

Але вось прайшлі выбары і вучоба ў тэатры паступова пачала аслабяваць. Замест трох гурткоў у нас працуе толькі адзін — палітгуртох і то нездавальняюча — яго наведваюць не больш 60 процантаў работнікаў тэатра. Зусім не ахоплены палітвучобай рабочыя сцэны і тэхперсанал.

Дрэнна абстаіць справа з тэхнічнай вучобай. Амаль ніхто не вучыцца. А між іншым, нашаму калектыву (які складаецца на 90 процантаў з моладзі) больш як каму трэба вучыцца. Тут галоўная віна мастацкага кіраўніка тэатра тав. Міровіча і рэжысёра тав. Палічынецкага, якія не знаходзяць часу для наладжання вучобы. Не меншая віна ў гэтым і комсамольскай арганізацыі, якая прымірэнцка адносіцца да зрыву вучобы.

Мы зацікаўлены ў правільнай і карыснай загрузцы творчай работай усяго акторскага складу тэатра. Тут на першы план паўстае пытанне аб дубляжы. Зараз у нас амаль ва ўсіх п'есах два склады выканаўцаў. У спектаклі «Таямнічы востраў», які ставіць рэжысёр-комсамолец Палічынецкі, пачынаючы з першай рэпетыцыі працуюць два склады актораў па чарзе, маючы аднолькавую колькасць рэпетыцый.

Гэтым самым мы вырашаем праблему творчай загрузкі ўсяго калектыва. Горш у нас з творчай нагрузкай жаночага складу. Тут віна драматургаў, якія вельмі мала пішуць ролей для нашых жанчын-актрыс. Выхаванне маладога калектыва — адказнейшая і складаная справа. На вялікі жаль, тут не зусім правільную пазіцыю займае мастацкае кіраўніцтва, якое абмяжоўвае творчыя магчымасці маладых актораў спецыяльным амплуа. Напрыклад, актораў Вайнштэйна і Фрыдмана рэжысура спецыялізіруе толькі на вобразах шкоднікаў (спектаклі «Наша зброя» і «Ноч у верасні»). Не выхоўваецца маладая рэжысура.

За апошні час наша арганізацыя вырасла. Мы прынялі ў ЛКСМБ чатырох новых таварышоў. Але, улічваючы агульную колькасць моладзі ў тэатры, гэтага вельмі недастаткова. З прынятымі таварышамі не вядзецца выхаваўчай работы.

За час існавання тэатра партком ні разу не разглядаў пытання аб рабоце комсамольскай арганізацыі. Гэты факт ясна гаворыць аб тым, як кіруе партыйная арганізацыя комсамолам. Толькі за апошні час парторг тав. Марголін пачынае цікавіцца комсамольскай арганізацыяй.

Не лепш абстаіць справа і з прыёмам комсамольцаў у партыю. За ўвесь час рэкамендавана ў партыю толькі два чалавекі, але афармленнем гэтых таварышоў парткомам мала цікавіцца. Не створана яшчэ пры тэатры група спачуваючых.

Зараз увесь ленінскі комсамол і совецкая моладзь краіны Советаў з вялікім натхненнем рыхтуецца да свайго слаўнага свята — XX гадавіны комсамола. Да гэтай гістарычнай даты тэатр рыхтуе антыфашысцкую п'есу маладога драматурга Шыбаленка, якая паказвае гераічную барацьбу нямецкай компартыі і комсамола з крывавым фашызмам.

Комсамольская арганізацыя ўзяла шэфства над гэтым спектаклем. Яе абавязак своечасова і высокаякасна падрыхтаваць мастацкі падарунак комсамолу і моладзі Совецкай Беларусі.

Комсамольская арганізацыя Тэатра юнага гледача — адна з буйнейшых арганізацый нашых тэатраў. Гэта абавязвае нас працаваць узорна, каб на нашым вопыце вучыліся іншыя арганізацыі тэатраў рэспублікі.

Каб справіцца з гэтай пачэснай задачай, трэба працаваць не так, як да гэтага часу, кампанейска, выпадкамі, а па-большэвіцку, планава, замацоўваючы дасягненні, якіх мы дабіліся ў палітыка-масавай рабоце на выбарах у Вярхоўны Совет БССР, мабілізуючы рэволюцыйную пільнасць і непрымірымасць нашай моладзі да ворагаў народа.

Ул. СТЭЛЬМАХ.



«Ленін і Сталін»—новая работа беларускага скульптара З. АЗГУРА.
Фота І. Каплінскага.

Камбрыг **М. ГРОМАЎ**
Герой Совецкага Саюза.

МАСКВА—ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС—ЗША

Да гадавіны нашага пералёту ў Амерыку

12 ліпеня, у 3 гадзіны 21 мінуту па маскоўскаму часу, чырвонакрылы самалёт адарваўся ад бетоннай дарожкі Шчолкаўскага аэрадрома, адкуль 18 чэрвеня вылецеў па таму-ж напрамку самалёт Валерыя Чкалава, Георгія Байдукова і Александра Белякова.

Праз 62 гадзіны 17 мінут пасля старту я пасадзіў машыну ў даліне Сан-Джасінто, размешчаную за 10.148 кілометраў ад Масквы. Адначасова ўдалося пабіць два сусветныя рэкорды — на дальнасць палёту па прамой і па ломанай. Дасягненне адважных французскіх пілотаў — Росі і Кодос, праляцеўшых па прамой 9.104,7 кілометра, — было перакрыта.

У далёкі палёт мы, трое совецкіх людзей, адправіліся натхнёныя таварышам Сталіным. Натуральна таму, што хутка пасля пасадкі ў сталіцу свяшчэннай совецкай зямлі радыётэлеграф перадаў наступныя нашы словы:

«МАСКВА, КРЭМЛЬ, СТАЛІНУ

Экіпаж выражае сваю адданасць, любоў і ўдзячнасць за тое давер'е, якое Вы нам аказалі. Прысвячаем наш пералёт Вам, вялікаму правадыру народаў.

ГРОМАЎ, ЮМАШЭЎ, ДАНІЛІН».

Выбраны намі маршрут праз Зямлю Франца-Іосіфа, Паўночны полюс, астравы Патрыка і Бенкса нельга назваць лёгкім. Неспрыяльнымі ў значнай частцы шляху былі і метэаралагічныя ўмовы.

Ужо праз 20 мінут пасля ўзлёту, калі перагружаная машына ішла на вышыні 400 метраў, зямля скрылася перш за воблакамі, а затым за туманам.

Да берагоў Барэнцава мора прышлося прабівацца ў сляпым палёце два навальнічных фронты. За востравам Калгуевым, дзе спартыўныя камісары зарэгістравалі час праходу самалёта над кантрольным пунктам, мы з 200-метравай вышыні падняліся ўверх і зніжаліся зноў толькі пасля таго, як убачылі берагі Новай Зямлі. Тут нас таксама чакалі спартыўныя камісары.

Далейшы шлях ляжаў над воблакамі. Скрозь рэдкія «вокны» ў воблачнасці віднеліся крыгі і вада.

Па радыёмаяку вострава Рудольфа мы павялі машыну дакладна па курсу «норд». Хутка цень ад нашага самалёта быў відзен на вяршынях гор Зямлі Франца-Іосіфа, якія прыкметна вылучаліся з густога туману.

За востравам Рудольфа заслона воблакаў зусім закрыла ільды Цэнтральнага палярнага басейна. Магутны цыклон перагарадзіў шлях на Паўночны полюс. Давялося перамагчы яго на вышыні ў 4.500 метраў — паміж двума слаямі воблакаў. Тут экіпаж правёў першую барацьбу з абледзяненнем самалёта.

Пралятаючы над Паўночным полюсам, мы паслалі прывітальную радыёграму адважным зімоўшчыкам дрэйфуючай станцыі — таварышам Папаніну, Крэнкелю, Шыршову і Фёдараву.

Прабіўшы ўсляпую яшчэ адзін цыклон, мы хутка ўбачылі астравы Патрыка і Бенкса. Яны былі акружаны вялізнымі лёдавымі палямі. Толькі на поўдзень ад вострава Бенкса адкрылася чыстая вада.

Хутка самалёт паляцеў над нежыццёвымі берагамі Канады, спярэшчанымі балотамі і азёрамі.

Да Скалістых гор надвор'е спрыяла палёту. Далей мы зноў сустрэлі магутны цыклон. Пры моцнай баўтанцы я пачаў узнімаць самалёт кверху, каб прабіць цыклон, не ўхіляючыся ад прамога шляху. Прыборы паказвалі 5.500 метраў вышыні. Машына пачала пакрывацца лёдам, а вада радыятара ў разрэджаным прасторы была блізка да кіпення. Давялося знізіцца да 3.500 метраў.

У раёне Сіэтля мы накіраваліся да ўзбярэжжа Ціхага акіяна.

Калі па разліках штурмана самалёт вышаў да акіяна, пад намі стала суцэльная заслона воблакаў. Арыентыроўка была аблегчана толькі магутнымі радыёмаякамі, якія беспамылкова паказвалі нам шлях.

Да Сан-Францыско самалёт падышоў ужо ноччу. Горад напалову быў закрыт нізкімі воблакамі. Відна была толькі яго прыбярэжная частка.

На далейшым шляху машыну весці было лягчэй, бо на адлегласць, прыкладна ў 25 міль адзін ад другога, ярка мігалі чырвоныя і белыя агні аэрамаякоў.

Досвіткам мы прыляцелі ў раён Лос-Анжэлоса. Бераг акіяна і ўсе аэрадромы былі ахутаны туманам. Давялося ляцець далей да Сан-Дыего, да мексіканскай граніцы. Аднак і тут аэрадромы былі закрыты туманам. Тады царашылі вярнуцца на поўнач і шукаць пасадачную пляцоўку паміж гор. Нарэшце такая пляцоўка была знойдзена. Я некалькі разоў агледзеў яе з паветра, некалькі разоў прайшоў над ёю брыючым палётам і, нарэшце, павёў машыну на пасадку.

Вельмі хутка да нашага самалёта пачалі сцякацца натоўпы народа. З усіх канцоў несліся аўтамабілі.

Нашай першай марай пасля таго, як мы закончылі свой палёт, было вярнуцца, хутчэй вярнуцца ў сваю любімую краіну для таго, каб падзяліцца радасцю са сваім вялікім народам, для таго, каб хутчэй убачыць натхніцеля нашага пералёту Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Два пералёты совецкіх лётчыкаў з Масквы праз Паўночны полюс у Злучаныя Штаты Амерыкі паказалі ўсяму свету, што трансапалярная паветраная траса ў поўнай меры прыгодна для рэгулярных найкарацейшых зносін паміж двума вялікімі краінамі свету. Справа толькі ў абсталяванні гэтай трасы, расстаноўцы радыёмаякоў, падрыхтоўцы прамежных авіябаз і т. д.

Пералёт цераз Цэнтральны палярны басейн паказаў таксама сілу і магутнасць нашай совецкай авіяцыі, гатоўнасць совецкіх людзей рабіць любыя подвігі для шчасця і славы сваёй працоўнай радзімы.

АЗДАРАВІЦЬ УПРАЎЛЕННЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ

Да апошніх дзён на чале Упраўлення па справах мастацтваў стаяў заклятьт вораг народа, актыўны удзельнік банды польскіх шпіёнаў — Шаранговіча, Галадзеда і Чарвякова. Карыстаючыся палітычнай слепатой, поўнай стратай большэвіцкай пільнасці партыйнай арганізацыі Упраўлення, гэта фашысцкая гадзіна шкодзіла на фронце совецкага мастацтва, развальваючы нашы мастацкія ўстановы. Гаворачы пра гнусную дзейнасць гэтага ворага народа, мы павінны з асаблівым абурэннем сказаць аб непартыйнай пазіцыі партарганізацыі Упраўлення па справах мастацтваў (парторг тав. Мельнікаў і нам. парторга тав. Любамірскі), якая, ведаючы пастанову XVII з'езда КП(б)Б і выступленні дэлегатаў з'езда аб шкодніцкай дзейнасці на фронце мастацтва, аб варожай рабоце кіраўніка Упраўлення, засталася глухой да сігналаў і рашэнняў XVII з'езда партыі. Партарганізацыя да гэтага часу не абмяркавала рашэнняў з'езда.

Нават беглы агляд становішча спраў у галіне мастацтва красамоўна сведчыць аб велізарнай шкодзе, якую прынеслі совецкаму мастацтву подлы вораг народа і палітычныя сляпцы, якія працуюць у апараце Упраўлення.

Важнейшай справай з'яўляецца арганізацыя рэпертуару тэатраў, высокаідэйнага па свайму зместу і высокамастацкага па сваёй форме, паказ у мастацтве лепшых людзей нашай краіны, кіраўнікоў партыі і ўрада Совецкага Саюза, якія прывялі наш народ да шчаслівага і раднснага жыцця. Ніхто іншы, як вораг народа пад носам кіруючых працаўнікоў Упраўлення тт. Рубінштэйна, Любамірскага і Уханава, пусціў варожую тэорыйку пра тое, што ў беларускіх тэатрах няма акцёраў, якія здольны працаваць над вобразам вялікага генія чалавецтва Уладзіміра Ільіча Леніна. У той час, калі ў радзе абласных тэатраў Саюза з вялікім поспехам пастаўлены п'есы з вобразам Леніна, беларускім тэатрам было катэгарычна забаронена працаваць над п'есамі тт. Карнейчука, Пагодзіна і Трэнёва, дзе выведзен вобраз Ільіча. Толькі ў апошні час калектыў Віцебскага тэатра наперакор ворагу, пачаў працу над пастаноўкай п'есы Пагодзіна «Чалавек з ружжом».

Раздаючы велізарныя дзяржаўныя сродкі на напісанне п'ес людзям, сярод якіх ёсць і такія, якія не заслужылі сваёй мінулай творчай дзейнасцю права на атрыманне гэтых грошай, ігнаруючы маладых, здольных літаратараў, шкодніцкае кіраўніцтва Упраўлення свядома абыходзіла задачу стварэння хвалюючых п'ес аб таварышах Ежове, Кагановічу, Калініне, Фрунзе, Орджанікідзе, Дзержынскім і аб вялікім Сталіне, якія вызвалілі беларускі народ ад яго спрадвечных ворагаў — польскіх паноў, стварылі беларускую дзяржаўнасць і забяспечылі нашаму народу шчаслівае і радаснае жыццё.


У рэпертуар беларускіх тэатраў з благаславення рэперткома ўключана антымастацкая п'еса «У нашы дні». П'еса «Агні маяка» Карасёва, якая мае сур'ёзныя прынцыповыя недахопы, пастаўлена цэлай групай беларускіх тэатраў.

Работа Упраўлення па справах мастацтваў вялася ворагам народа ў такім напрамку, каб сарваць стварэнне беларускай совецкай оперы і балета. У самы адказны момант работы над першай беларускай операй «Міхась Падгорны», у канцы мінулага года, былі ашэльмаваны і выгнаны з Опернага тэатра высокакваліфікаваныя майстры опернага мастацтва — галоўны рэжысёр тэатра Смоліч і галоўны дырыжор Акулаў, якія зараз працуюць у лепшых тэатрах Саюза (Масква і Кіеў).

Опера «Дрыгва» дэпутата Вярхоўнага Совета БССР тав. Багатырова, над пастаноўкай якой ужо асабіста працуе народны артыст СССР В. І. Неміровіч-Данчэнка, у беларускім Оперным тэатры не мае яшчэ пастановачнай брыгады.

Першы беларускі балет маладога таленавітага кампазітара Крошнера «Салавей» прынят да пастаноўкі ў оперных тэатрах Украіны, а ў беларускім Оперным тэатры ён яшчэ не мае пастаноўшчыка.

Сумленныя творчыя работнікі Опернага тэатра і Кансерваторыі летам мінулага года, аб'ехаўшы ўсе куткі нашай рэспублікі, сабралі вялікую харавую студыю з ліку найбольш здольных народных талентаў. Творчыя работнікі былі ахоплены адным жаданнем: як мага хутчэй ліквідаваць шкодніцтва ў галіне падрыхтоўкі вакальных кадраў. Аднак, гэта студыя была разагнана і ліквідавана. Замест студыі ў тэатры засталося некалькі чалавек.



Дом Чырвонай Арміі ў Менску. Фота І. Каплінскага.

Грубейшым скажэннем совецкай палітыкі ў галіне заработнай платы шкоднікі нацкоўвалі творчыя кадры братніх рэспублік, якія працавалі ў Оперным тэатры, на беларускія совецкія оперныя кадры гэтага-ж калектыва, распальваючы групаўшчыну сярод работнікаў тэатра.

Толькі за апошні год утрыманне Дзяржаўнага беларускага опернага тэатра каштавала рэспубліцы тры з паловай мільёны рублёў. А іграў тэатр усяго дваццаць дзён. Калектыў Тэатра оперы і балета не ачышчан ад работнікаў нізкай мастацкай кваліфікацыі.

Варожая рука, якая арудавала ва Упраўленні, блытанымі ўстаноўкамі свядома зацягвала будаўніцтва Вялікага опернага тэатра. Не гледзячы на простыя і ясныя дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР па пытанню аб будаўніцтве Опернага тэатра, велізарны калектыў тэатра, які толькі-што вярнуўся з адпачынку, не мае магчымасці прыступіць да работы ў новым памяшканні. Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што агульны сход Тэатра оперы і балета, які адбыўся ў маі гэтага года, аднадушна выказаў недавер'е цяперашняму кіраўніку тэатра тав. Ярыкаву, але, не гледзячы на гэта і на загад Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў адносна тав. Ярыкава, ён усё яшчэ застаецца на пасадзе кіраўніка тэатра, тармозячы яго работу.

Гора-кіраўнікі Упраўлення тт. Рубінштэйн, Уханаў і Любамірскі спакойна назіралі ўсю гэту подлую дзейнасць ворага народа, які узначальваў Упраўленне, палец аб палец не ўдарылі для выкрыцця яго правакацыйных паводзін. Нават пасля XVII з'езда КП(б)Б і прамых сігналаў нашага большэвіцкага друку, пасля нарады актыва работнікаў мастацтваў і схода Опернага тэатра, якія адбыліся ў маі гэтага года, яны нічога не зрабілі для выкрыцця ворага.

Шкодніцкая рука дала сябе адчуць і ў кіраўніцтве Тэатрам музкамедыі. Там за год быў пастаўлен усяго адзін новы спектакль, у той час, калі ў яго рэпертуары захоўваюцца некаторыя варожыя совецкаму мастацтву, фармалістычныя спектаклі. І ў гэтым тэатры, пры патуранні кіраўнікоў Упраўлення, транжыраюцца дзяржаўныя грошы. Толькі за першае паўгоддзе 1938 года растранжырана 280 тысяч рублёў народных грошай звыш прадугледжаных каштарысам. У выніку цяжкога становішча ў тэатры рад кваліфікаваных акцёраў, без якіх не можа працаваць трупа, зараз пакінулі калектыў Музкамедыі.

Узнікае пытанне — чаму начальнік фінансава-планавага аддзела Упраўлення тав. Бойген, які заклікан змагацца за правільнае скарыстанне дзяржаўных грошай, дазволіў так безгаспадарча выдаткаваць каля 4 мільёнаў рублёў?

Вельмі характэрнымі для «стылю» работы Упраўлення з'яўляецца яго адносіны да Яўрэйскага тэатра. Пасля выкрыцця ворага народа, які на працягу шасцінаццаці год арудваў у гэтым тэатры, гора-кіраўнікі не толькі не паклапаціліся аб умацаванні рэжысуры гэтага тэатра, больш таго — далі доўгатэрміновы адпачынак рэжысёру тэатра Галаўчынеру і прызначылі на яго месца такога таварыша, які за ўсё сваё жыццё не паставіў ні аднаго спектакля. І не дзіўна, што за восем месяцаў знаходжання ў тэатры, дзе ён атрымоўвае вялікую стаўку, гэты таварыш абсалютна нічога не зрабіў.

Такую-ж «дапамогу» Упраўленне аказала і Віцебскаму тэатру. Адклікаўшы адтуль мастацкага кіраўніка тав. Даршвішэва, на яго месца яно нікога не прызначыла і тэатр працуе без мастацкага кіраўніка.

Тэатр юнага гледача, рэпертуар якога ў свой час быў засмечан варожай пісанінай буржуазных нацыяналістаў, цяпер не мае ні адной п'есы аб жыцці беларускага народа.

У Рускім тэатры БССР проста ігнаруецца пастанова Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў аб стацыяніраванні тэатраў. Значная група кваліфікаваных акцёраў чамусьці ад'язджае на работу ў іншыя гарады Совецкага Саюза, а замена іх новымі выканаўцамі ў рэпертуары патрабуе дадатковых грашовых затрат. Рускі тэатр, які павінен дэманстраваць узоры рускай тэатральнай культуры, вымушан палітыкай фінансавання Упраўлення выпускаць многія спектаклі ў тры-чатыры тыдні, у той час, як беларускім тэатрам дадзена магчымасць працаваць над прэм'ерай па два-тры месяцы. У выніку такой буржуазна-нацыяналістычнай устаноўкі некаторыя работы Рускага тэатра па сваёй невысокай мастацкай якасці не даюць уяўлення аб перадавым у свеце тэатральным мастацтве рускага народа.

Нічога не зроблена для ліквідацыі шкодніцтва ў перыферыйных тэатрах. Абласныя калгасна-соўгасныя тэатры не атрымалі ад Упраўлення сродкаў для работы з драматургамі. Іх рэпертуар у пераважнай большасці падабран бессістэмна. Не вядзецца ніякай выхаваўчай работы з маладымі акцёрамі. Рад тэатраў (Полацкі, Барысаўскі, Рагачоўскі) не маюць памяшканняў. Рад калгасна-соўгасных тэатраў не ўкамплектаван кіруючым творчым складам, а ў большасці з іх нехапае кваліфікаваных акцёраў.

Зусім адсутнічае ідэйна-творчае кіраўніцтва рэпертуарам тэатра. На чале рэперткома пры Упраўленні, не гледзячы на шматлікія сігналы друку, да гэтага часу застаецца абсалютна не адпавядаючы пасадзе па сваёй дзелавой кваліфікацыі і палітычнай падрыхтоўцы тав. Любамірскі. Знаходжанне яго на гэтай адказнай пасадзе можна вытлумачыць толькі сямейнасцю і кругавой парукай, якая пануе ў партарганізацыі Упраўлення па справах мастацтваў і пабудавана на правіле «не чапай мяне і цябе не крану».

Поўную няздольнасць кіраваць тэатральнай справай паказаў і начальнік тэатральнага сектара Упраўлення тав. Уханаў. Пра гэта гаварылася на ўсіх актывах, нарадах і сходах работнікаў мастацтваў. І аб гэтым рэзка і прама пісаў наш большэвіцкі друк, аднак ён працягвае займаць пасаду начальніка тэатральнага сектара і зараз.

Шкодніцкая дзейнасць варожага кіраўніцтва Упраўлення відаць і на становішчы музыкальнага фронта БССР. Пра гэта на ўвесь голас гаварылі кампазітары на сваім справаздачна-перавыбарчым сходзе. За развал работы Саюза кампазітараў, які быў адзначан у пастанове схода, нясе палітычную адказнасць і тав. Рубінштэйн, які ва Упраўленні непасрэдна кіраваў і кіруе музычным фронтам.

Шмат парадная шуміхі і ў рабоце беларускай Філармоніі. Стварыўшы цэлы рад вельмі важных мастацкіх калектываў, Упраўленне па справах мастацтваў не наладзіла выхавання маладых мастацкіх кадраў Філармоніі, не забяспечыла ўсе калектывы высокакваліфікаваным мастацкім кіраўніцтвам і рэпертуарам. Сур'ёзныя недахопы выявіліся ў часе выступлення ансамбля беларускай песні і пляскі ў Маскве.

Нельга называць інакш, як актам шкодніцтва, ліквідацыю Упраўленнем Белдзяржэстрады, у задачы якой уваходзіла выхаванне беларускіх мастацкіх эстрадных артыстаў і калектываў і абслугоўванне імі ў першую чаргу перыферыі нашай рэспублікі. Атрымаўшы функцыі гастрольбюро, дырэктар Філармоніі тав. Прагін давёў гэты ўчастак работы амаль да поўнага развалу.

Нічога грунтоўнага яшчэ не зроблена ў галіне ліквідацыі шкодніцтва ў справе выхавання музыкальных і вакальных кадраў. Як Кансерваторыя, так і музыкальнае вучылішча не атрымоўваюць ніякага кіраўніцтва з боку Упраўлення. Музсектар Упраўлення існуе толькі на паперы. Пра гэта неадназначна пісалі дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тт. Багатыроў і Туранкоў і кампазітар Аладаў у артыкуле «Хто кіруе музычным фронтам» («Звязда»).

У выніку адсутнасці кіраўніцтва з боку Упраўлення фронтам выяўленчага мастацтва на гэтым участку таксама нічога не робіцца ў напрамку ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. Да гэтага часу яшчэ не створан Саюз совецкіх мастакоў БССР. Сярод мастакоў не зжыта беспрынцыпная групавая барацьба. Мастакі не арганізаваны на стварэнне высокамастацкіх палотнаў, адлюстроўваючых шчаслівае і радаснае жыццё беларускага народа пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Многія жывапісцы і скульптары пазбаўлены магчымасці працаваць з прычыны адсутнасці майстэрняў.

Наша партыя і вялікі мудры правадыр народаў таварыш Сталін праяўляюць вялікія клопаты да растучых мастацкіх кадраў з нетраў совецкага народа. У беларускім народзе ёсць шмат таленавітых мастакоў-самавучак, аднак шкоднікі з Упраўлення па справах мастацтваў і з мінулага кіраўніцтва Саюза мастакоў зрабілі ўсё ад іх залежачае, каб развяліць работу мастацкіх студый і выхаванне маладых таленавітых мастакоў з народа.

Вельмі моцна і адчувальна варожая рука прайшлася па фронту самадзейнага мастацтва. Створаны два гады назад Дом народнай творчасці (дырэктар тав. Рубенчык) да гэтага часу знаходзіцца ў маленькім пакойчыку апарата Упраўлення па справах мастацтваў і адарваны ад мастацкай самадзейнасці. Уся работа гэтай бюракратычнай канцылярыі, якая існуе пад шыльдай цэнтра мастацкай самадзейнасці, зводзіцца да канцылярскай перапіскі і нуднага адсежвання рабочых гадзін. Апарат гэтай установы, які налічвае 21 асобу і каштуе дзяржаве шмат грошай, не мае ні аднаго кваліфікаванага работніка па мастацтву. Шкодніцкі развал цэнтра мастацкай самадзейнасці адбываецца на вачах партарганізацыі Упраўлення і намесніка начальніка Упраўлення тав. Рубінштэйна, які непасрэдна кіраваў і кіруе «домам» з дня яго арганізацыі і па сёнешні дзень. У апараце Дома народнай творчасці ў якасці «спецыяліста» па выяўленчаму мастацтву падвізаўся польскі шпіён, аб варожай дзейнасці якога своечасова сігналізавала наша газета. Аднак тт. Рубенчык і Рубінштэйн не звярнулі ўвагі на сігналы друку.

Тав. Рубінштэйн знаходзіцца ў апараце Упраўлення на кіруючай рабоце каля двух год (дырэктар Дома народнай творчасці, начальнік музсектара, парторг і нарэшце намеснік начальніка Упраўлення). Партыйная арганізацыя, правільна апаніўшы яго нягодную работу ў якасці парторга, павінна высветліць і даць адказ мастацкай грамадскасці на наступнае пытанне: чым тлумачыцца, што Рубінштэйн на працягу амаль года знаходзіцца на пасадзе намесніка начальніка Упраўлення па справах мастацтваў без зацвярджэння ЦК КП(б)Б і Соўнаркома БССР, будучы прызначаным на гэту пасаду, у парушэнне совецкай дэмакратыі, загадам выкрытага зараз ворага народа.

Святы абавязак партарганізацыі Упраўлення па справах мастацтваў — з усёй большэвіцкай рашучасцю ачысціць апарат Упраўлення ад людзей, якія па сваіх палітычных якасцях і дзелавой кваліфікацыі не здолелі забяспечыць кіраўніцтва совецкім мастацтвам БССР.

Святы абавязак партыйнай арганізацыі Упраўлення — разгарнуць неадкладна работу па ачыстцы мастацкіх устаноў ад чужых совецкаму мастацтву людзей і пачаць сапраўды большэвіцкую падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва, якая павінна адбыцца ў сталіцы нашага Саюза — Маскве ў 1939 годзе.

ДЗІМІТРЫЙ ІВАНАВІЧ ПІСАРЭЎ

(Да 70-годдзя з дня смерці)

Росквіт грамадскай і літаратурнай дзейнасці магутнага таленту Пісарэва звязан са славутымі шасцідзесятымі гадамі мінулага стагоддзя. У гэтае дзесяцігоддзе ён аформіўся палітычна як прагрэсіўны радыкал-дэмакрат, як абаронца рускага народа ад памешчыкаў і капіталістаў, ад самадзяржаўя і праваслаўя.

Энергічны і моцны, дапытлівы і аналітычны розум Дзімітрыя Іванавіча Пісарэва ўзняў шмат праблем палітычна-гістарычнага, асветніцка-гуманістычнага, выхаваўча-педагагічнага і філасофска-літаратуразнаўчага характару. Сваёй пастаноўкай, сваім вырашэннем пытанняў Пісарэў адыграў вялікую прагрэсіўную ролю, пакінуў надзвычай прыкметны след у развіцці нашай вызваленчай думкі і нашага літаратуразнаўства.

Пісарэў у сваім таленавітым і палка-сатырычным артыкуле аб замежным шпіёне-літаратару Шэдо-Фероці выступае ў абарону вялікага рускага рэвалюцыянера-дэмакрата Герцэна і рускага народа ад царскага самаўладства і паліцэйска-жандарскага сваволля і беззаконнасці. У гэтым артыкуле ён паставіў з усёй вастрынёй і рашучасцю, без ценю хістання, кардынальную праблему свайго часу. У ім мы чытаем: «Нізвяржэнне... і змена палітычнага і грамадскага ладу складаюць адзіную мэту і надзею ўсіх чэсных грамадзян. Каб пры цяперашнім становішчы спраў не жадаць рэвалюцыі, трэба быць ці зусім абмежаваным, ці зусім падкупленым на карысць пануючага зла.

Паглядзіце, рускія людзі, што робіцца навакол нас, і падумайце, ці можам мы далей цярпець гвалт, які прыкрываецца ўстарэлай формаю бажэственага права. Паглядзіце, дзе наша літаратура, дзе наша народная адукаванасць, дзе ўсе добрыя пачынанні грамадства і моладзі. Прычапіўшыся да двух-трох выпадковых пажараў, урад усё праглынуў; ён будзе праглынаць ўсё — і грошы, ідэі, людзей, будзе праглынаць да таго часу, пакуль маса праглынутая не разарве гэтую агідную пачвару. Васкрэсныя школы закрыты, народныя чытальні закрыты, два журналы закрыты, турмы напакаваны чэснымі юнакамі, любячымі народ і ідэю, Пецярбург пастаўлен на ваеннае становішча. Урад мае намер дзейнічаць з намі, як з непрымірымымі ворагамі. Ён не памыляецца. Прымірэння няма».


Пісарэў перад намі выступае як рэвалюцыянер-дэмакрат. Ён верыць, што ўсе злачынствы ўрада супроць народа адгукнуцца яму ў дзень страшнага народнага суда, які прыдзе не сёння—заўтра. Гэты суд, на яго думку, разбурыць і знішчыць спарахнелы дэспатызм і спарахнелую рэлігію. Тое, што мёртва і гніла, павінна пасці, зваліцца ў магілу, а народу застаецца толькі даць ім апошні, але рашучы штуршок і закідаць брудам іх смярдзючыя трупы. Прымірэння паміж народам і ўрадам няма і не можа быць.

Пісарэў узняўся на вышыню палітычнай рэвалюцыйнай думкі. Ён кліча народ да рэвалюцыйнай расправы над сваімі катамі і эксплаататарамі ў імя царства розуму, у імя гуманнасці і натуральных чалавечых правоў і годнасці. За гэтыя рэвалюцыйна-дэмакратычныя погляды яго саджаюць у Петрапаўлаўскую крэпасць. Але і ў казематах крэпасці ён з упартасцю і энергіяй прадаўжае працаваць над пытаннямі, хвалюючымі сучаснасць. Лепшыя свае творы ён напісаў у крэпасці.

Умовы, у якія ён трапіў, не спрыялі разгортванню палітычных поглядаў у памянёным кірунку. Зараз ён акцэнтуе сваю прапаганду за эмансіпацыю асобы, выступае супроць прыгнечання яе з боку грамадства і сям'і. Ён мяркуе, што праз разумны эгаізм, праз павелічэнне кадраў мыслячых рэалістаў, праз прагрэс навук, у асаблівасці прыродазнаўства, і распаўсюджанне асветы павінна наступіць сацыяльна-палітычнаеператварэнне краіны і вызваленне асобы.

Па сваіх філасофскіх перакананнях Пісарэў быў паслядоўнікам нямецкіх натуралістаў 50-х гадоў мінулага стагоддзя — Бюхнера, Фогта і Молешота. Светапогляды гэтых натуралістаў Фрыдрых Энгельс характарызаваў як «танны», «апошлены, вульгарны від» матэрыялізма. Гэты від матэрыялізма ў Германіі, пры наяўнасці больш высокай якасці матэрыялізма Л. Фейербаха, а таксама зарадзіўшагася і развіваючагася дыялектычнага матэрыялізма Маркса і Энгельса, не мог адыграць станоўчай ролі.

У Расіі склалася іншая гістарычная абстаноўка. У сувязі са смерцю Дабралюбава, арыштам і высылкай Чэрнышэўскага, вымушанай эміграцыяй Герцэна ў літаратуры і на кафедрах распаясаліся махровыя ідэалісты і містыкі. Выступленні Пісарэва з пазіцый гэтага віду матэрыялізма адыгралі станоўчую прагрэсіўную ролю.



Наперакор сваім памылковым палажэнням, Пісарэў, прапагандыруючы, распаўсюджваючы і папулярызуючы прыродазнаўства, наносіў удар за ўдарам па ідэалізму і містыцызму. Ён у Расіі першы зразумеў велізарнае гістарычнае значэнне дарвінізма. У сваім артыкуле «Прагрэс у свеце жывёл і раслін» Пісарэў лічыць, што ідэі Дарвіна знаходзяцца ў непарыўнай сувязі з агульным рухам чалавечай думкі, што яго вучэнне — не выпадковая з'ява, не параджэнне капрызнага розуму, а законнае і натуральнае дзіця стагоддзя, пільная патрэба часу. На яго артыкулах, прысвечаных распаўсюджанню прыродазнаўства і вучэнню Дарвіна, выхоўвалася прагрэсіўная моладзь, якая ў выніку дала для нашай навукі масу слаўных імёнаў.

Публіцыст Пісарэў у рускай гісторыі вядом як таленавіцейшы крытык мастацкіх твораў. Ён у сваіх лепшых работах «Московские мыслители», «Генрих Гейне», «Базаров», «Разрушение эстетики», «Реалисты», «Роман кисейной девушки», «Мотивы русской драмы», «Пушкин и Белинский» і інш. выкладае свой пункт гледжання на мастацтва і з гэтага пункту гледжання робіць аналіз мастацкіх твораў і выведзеных у іх тыпаў.

Ён выступае рашучым і паслядоўным змагаром супроць ідэалістычнай эстэтыкі і так-званай тэорыі «мастацтва для мастацтва». На першых кроках сваёй дзейнасці ён патрабуе ад мастацтва сугубай ідэйнасці, патрабуе прапаганды праз мастацтва навуковых ведаў аб прыродзе і грамадстве, патрабуе прапаганды ідэй гуманізма, асветы, прагрэсу, павагі да чалавечай годнасці.

Некалькі пазней Пісарэў устанаўляе, што «сапраўднае мастацтва ёсць чужаедная расліна, якая заўсёды жыве сокамі чалавечай раскошы, а таксама, што «у кожнага асобнага чалавека ствараецца свая ўласная эстэтыка і, значыць, агульная эстэтыка, прыводзячая асабістыя густы да абавязковага адзінства, становіцца немагчымай».

Ён робіць адсюль рашучы вывад: «эстэтыка як навука становіцца такой-жа недарэчнасцю, якой была-б, напрыклад, навука аб любві». Каб зрабіць крок наперад, вучыць Пісарэў, і каб сказаць разумнае слова, абудзіць свядомасць да грамадскіх абавязкаў, трэба знішчыць эстэтыку і накіраваць яе туды, куды накіраваны алхімія і астралогія.

Няправільна выводзячы генезіс мастацтва з чалавечай раскошы і стаўшы на чыста суб'ектыўныя і ўтылітарныя пазіцыі ў ацэнцы прадметаў, Пісарэў уступае ў палеміку з заснавальнікамі рускай эстэтыкі Белінскім і Дабралюбавым і адмоўна ставіцца да паэзіі Пушкіна.

Адмоўныя адносіны Пісарэва да Пушкіна з'явіліся не ў выніку неразумення яго паэзіі, а ў выніку таго, што сапраўдны, пратэстуючы і негадуючы, дэмакратычны і гуманны твар паэта быў схаваны ад крытыка дваранска-буржуазным пушкіназнаўствам.

Пісарэў тэарэтычна адмаўляе эстэтычныя прынцыпы, а пры крытычным аналізе твораў мастацтва павінен быў прытрымлівацца і прытрымліваўся паслядоўна пэўных эстэтычных правілаў, якія ён пераняў у сваіх славутых папярэднікаў.

«Справа крытыка, — піша Пісарэў,— састаіць іменна ў тым, каб разглядзець і разабраць адносіны мастака да паказваемага прадмета», а таксама з масы літаратурных помнікаў выбраць тое, што «можа садзейнічаць нашаму разумоваму развіццю і вытлумачыць, якім чынам мы павінны распараджацца гэтым адабраным матэрыялам». Выходзячы з гэтых правілаў, наш крытык пры разглядзе рамана Тургенева «Отцы и дети» гаворыць: «Мастацкая аддзелка беззаганна добрая: характары і палажэнні, сцэны і карціны намаляваны так наглядна і ў той-жа час так мякка, што самы адважны адмаўляльчік мастацтва адчуе пры чытанні рамана якуюсьці незразумелую асалоду».

Ён патрабуе, як рэаліст, тыповых, характэрных становішчаў для дзеючых асоб у творах мастацтва, а таксама таго, каб людзі маглі ў выведзеных вобразах пазнаваць сябе. Мастак павінен маляваць карціны жыцця без усякай утайкі, як сказаў-бы Белінскі, зрываць з жыцця заслоны. Пісарэў следам за Белінскім пракламіруе ідэю, што прырода і абставіны жыцця ствараюць мастака: «Хто па прыродзе і па выхаванню ўразлівы, ды хто засвоіў сабе ўмельства перадаць свае ўражанні другім так, каб яны маглі перадчуць тое што ён сам адчувае той і мастак». Здольнасць успрымаць, быць уразлівым залежыць ад прыроднага дару, а ўмельства перадаваць складае тэхнічны бок справы, якая набываецца навыкамі і практыкаваннямі.

Думку Белінскага аб ілжывай ідэі мастацкага твора, ад якой ён потым адмовіўся, Пісарэў давёў да лагічнага канца. Для яго «калі мысль зусім ілжывая, дык і ўвесь верш нікуды не годны» Прыступіўшы з гэтай ідэяй да твораў Пушкіна, ён у іх нічога не знайшоў, што садзейнічала-б разумоваму развіццю грамадства. Паэту Пушкіну ён супрацьпаставіў паэта Некрасава, да якога адносіўся з вялікай любоўю і павагай.

Мыслячы рэаліст, як ён сябе называе, Пісарэў у адпаведнасці з рускай класічнай крытыкай устанаўляе для твора мастацтва патрабаванні поўнай адпаведнасці формы зместу, зместу форме. Твор, на яго думку, павінен быць народным, глыбокім, вернай карцінай сучаснасці ці гісторыі. Калі вобраз, карціна не даведзены паэтам да поўнай яснасці і адчувальнасці, дык і думкі, ідэі твора не могуць дзейнічаць моцна і рабіць належнае ўражанне на пачуцці, а праз пачуцці на розум.

Крытык Пісарэў любіць дэмакратычны лагер паэтаў і пісьменнікаў—Някрасава, Памялоўскага, Слепцова — за тое, што яны горача спачуваюць пакутам простага чалавека, за чэснае слова, якое яны заўсёды гатовы сказаць за бедняка і прыгнечанага.

Дзімітрый Іванавіч Пісарэў, адмаўляючы аб'ектыўны крытэрый прыгожага, адмаўляючы эстэтыку як навуку, аднак пры разглядзе фактаў мастацтва прымушан быў выходзіць з палажэнняў эстэтыкі, якія былі выпрацаваны Белінскім, Дабралюбавым і Чэрнышэўскім.

У сваёй ацэнцы твораў Пісарэў узняў шмат новых і цікавых праблем літаратуразнаўства, сказаў сваё слова аб паэтах і пісьменніках свайго часу, даў узоры крытычнага аналізу твора, даў праўдзівае талкаванне такім вобразам, як Базараў («Отцы и дети»).

Пісарэў, як матэрыяліст-філосаф і як крытык-рэаліст, займаў самастойныя і арыгінальныя пазіцыі ў рускай гісторыі. На яго вырашэнне праблемы аб суадносінах паміж марай і рэчаіснасцю спасылаўся вялікі Ленін, на многія яго літаратурна-крытычныя ацэнкі твораў мастацтва спасылаецца наша совецкае літаратуразнаўства. Пісарэў з'яўляецца вялікім грамадскім і літаратурным дзеячом. У цяжкі час ён смела і рашуча абараняў інтарэсы працоўных мас ад самаўладства, смела і рашуча пераацэньваў пісьменнікаў і творы мастацтва.

Вялікі совецкі народ любіць і паважае такіх людзей, як Дзімітрый Іванавіч Пісарэў. 70-я гадавіна з дня яго смерці паслужыць штуршком да вывучэння яго велізарнай і багатай літаратурнай спадчыны, якая з'яўляецца вялікім здабыткам культуры нашага народа.

С. КАРАБАН.

ПЕРШЫЯ КРОКІ Ў ЛІТАРАТУРУ

Балай, кожны пачынаючы аўтар падобны на дзіця, якое вучыцца хадзіць. Крокі яго нясмелыя, няўпэўненыя. Ступіўшы два-тры разы, ён садзіцца адначыць і толькі потым зноў намагаецца ісці роўна, не хістаючыся і не трымаючыся рукамі за сустрэчныя рэчы. Ды гэта і зразумела. З большага яны маладыя не толькі ў справе авалодання складаным майстэрствам пісьменніка, яны маладыя і ў жыцці. Гэта звычайная комсамольская моладзь дапрызыўнага ўзросту, якая мае скончаную сярэднюю асвету альбо вучыцца ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. Жыццёвы вопыт гэтых таварышоў у значнай меры яшчэ абмежаваны і таму так часты на іх выказваннях штамп школьных фармуліровак і трафарэтныя ўзоры кніжнасці ў мове, сухая публіцыстычнасць і наіўнасць.

У творчасці ўсіх пачынаючых можна заглядаць аднолькавыя недахопы. Гэта мне давялося прасачыць на цэлым радзе фактаў па апавядальнаму жанру. Аднак тэмаю гэтага артыкула з'яўляецца не толькі разгляд недахопаў, гэта было-б несправядліва, а і паказ узораў дадатных, якія даюць падставу думаць, што сярод аўтараў, рукапісы якіх штодня атрымліваюцца габінетам маладога аўтара пры праўленні ССПБ, ёсць здольныя людзі і будучыя добрыя пісьменнікі.

Агульным недахопам усіх пачынаючых аўтароў з'яўляецца дрэннае веданне таго, пра што яны пішуць. А пішуць яны пра самыя рознастайныя рэчы. Напрыклад, Нічыпаровіч (Слуцк), рэкамендуючы сваіх герояў, кажа: «... Адзін быў слёсарам, акрамя таго быў рэдактарам заводскай шматтыражкі. Другі механікам (?) комсамольскага камітэта. Зразумела, што яны былі комсамольцы». Зусім не зразумела, тав. Нічыпаровіч, што гэта за пасада такая—«механік комсамольскага камітэта»? Мякка кажучы, гэта не адпавядае сапраўднасці.

У Холада (Чырвоная Слабада) пішацца пра затрыманне дыверсанта страшэнна наіўна і проста. У яго-ж піонерка Таня, вучаніца III класа, падпальвае калгас зусім як закаранелы дыверсант, чаго не можа быць у рэчаіснасці. У яго ёсць такі сказ: «Пагранічнікі дабягаюць да куста і стальным кальцом абкружылі яго». Апрача таго, што сказ пабудаван непісьменна, сама дзея да таго непраўдападобная, што пра гэта можа не ведаць мабыць толькі сам аўтар. Бо калі пагранічнікі абкружылі куст і пачалі перастрэлку з парушальнікамі, што заселі ў гэтым кусце, дык напэўна яны паранілі самі сябе.

Два аўтары — Александроўскі і Самсонаў (Гомель) у рукапісах «Пільнасць» і «Новая зямля» пішуць пра імперыялістычную вайну. У першага напісана: «Непрыяцель быў зусім блізка. І гэта наводзіла жах на рускіх салдат».

Гэта такая бязглуздзіца, якое нават і даводзіць не трэба. Досыць толькі сказаць, што ніводзін народ на свеце не мог і не можа пахваліцца такою вытрыманасцю, стойкасцю і адвагаю салдата сваёй арміі, якія ўласцівы былі рускаму салдату нават у часы феадальнага і буржуазнага панавання, і гэта выразна відаць на безлічных прыкладах геройства рускіх салдатаў, на ўсіх войнах, якія даводзілася весці рускай арміі і асабліва на апошніх двух: руска-японскай і сусветнай імперыялістычнай, пра якую Александроўскі і піша.

У Самсонава інакшага гатунку грэх. У гэтага наадварот: «Рускія пачалі планамерную бамбардыроўку нямецкіх акопаў з лёгкіх, сярэдніх і цяжкіх гармат адразу».

Аўтар і не здагадваецца, што рускай артылерыі праз увесь час вайны не ставала снарадаў. Вядома, што рускія таксама бамбардыравалі немцаў, але не гэтак, як кажа Самсонаў.

«Дваццаць тры пуды сталі разарваліся з пякельнай сілай».

Не было гэтага ніколі і няма ніякае патрэбы рабіць снарады са сталі.

Аўтар меў-бы рацыю, каб замест планамернасці бамбардыроўкі нямецкіх акопаў з боку рускай артылерыі сказаў аб меткасці агню рускай артылерыі, аб фізічнай вытрыманасці артылерыстаў. Гэта цалкам адпавядала-б рэчаіснасці.

Праўдзівасць і пераканальнасць твора залежыць ад падачы падзей, абмалёўкі тыпаў і абстаноўкі, як і ўсяго фону—у рэалістычным плане, з раскрыццём заложаных у рэчаіснасці супярэчнасцей, з глыбокім паказам ас-ноўнай накіраванасці. Есць творы, якія проста за душу бяруць, бо яны глыбока праўдзіва паказваюць нам людзей і падзеі. Адсюль і кожны факт, кожны ўчынак героя, кожны жэст павінен мець сэнс, а ўсе сродкі павінны пасабляць большай ідэйнасці твора. Няма нічога горшага, як неапраўданыя (не матываваныя) учынкі герояў, неабгрунтаваныя факты і падзеі, бо гэта псуе эфектыўнасць твора і зніжае яго мэтанакіраванасць.

Вялікі майстар французскай літаратуры А. Франс надаваў велізарнае значэнне драбніцам. У гэтым сэнсе паказальнай з'яўляецца праца яго над «Орлеанскай дзевай».

— Не кідайце пошукі,—гаворыць ён свайму супрацоўніку,—бо без дружынніка нам зусім няма на што траціць час на Жанну д'Арк. Калі я не даведаюся, адкуль ён у нас узяўся, я спалю дзеву другі раз.

Толькі тады, калі праз тры месяцы пошукаў дружыннік з Шампані, які павінен быў дзейнічаць у творы, знайшоўся ў адной гістарычнай працы, А. Франс з вялікім уздымам зноў узяўся за Жанну д'Арк.

Ен надаваў вялікае значэнне працы над словам. Аднойчы ён выпісаў сказ з аднаго біяграфічнага слоўніка. Сказ гэты гучаў так: «Пані дэ-Тэрульд была багатая і карысталася прыстойнай рэпутацыяй»

Ен перачытаў запісаны ў заўраднага гісторыка сказ і пасмяяўся з яго:

— Гэта плоска і прэсна, як блін. Але вы ўбачыце: мы ўбяром гэтую пані па-сучаснаму. Расстановім акцэнты,—кажа ён. І піша: «Таму што пані дэ-Тэрульд была багатая, дык ёй прыпісвалі прыстойную рэпутацыю».

Вось як змяніўся сэнс усяго сказу пад пяром вялікага майстра.

З усіх рукапісаў пачынаючых аўтароў, якія мне давялося прачытаць за апошнія 1—1½ месяца, відаць вялікае няўмельства ў працы над словам. Так, аўтар Смагаровіч піша:

«У **баку вёскі прахрыпеў** певень. Хрыпенне яго данеслася ветрам і было падобна на апошні стогн яўрэя».

Відавочная бяссэнсіца.

Вельмі часта героі гавораць не жывою моваю і які-небудзь дзядок год пад 80 выступае як прамоўца-комсамолец. Таксама часта мова герояў ніяк не адрозніваецца ад мовы аўтара. А сама мова з большага сухая і не цікавая. Таму і героі шэрыя і нічым не вылучаюцца з агульнае масы схем.

У А. Радзюка (Дзержынск) у апавяданні «У садзе» ёсць такі сказ: «Пышныя вусы, нібы белая пена, выбягаюць з дзедавага носа».

Сказ надзвычай няўдалы, бо вусы не могуць выбягаць, таксама як і пена, ды яшчэ з носу.

Падводзіць некаторых аўтароў і фантазія. Каб нібыта зрабіць цікавейшым твор, М. Жулянкоў (Віцебшчына) прымушае піонера Міхася блукаць па лесе, лазіць на дрэвы ў пошуках дыму, які выходзіў нібыта з зямлянкі ў лесе. Гэта «выдумка» яшчэ не ўся. Аўтар пасылае Міхася на дрэва і прымушае таго скінуцца. Скінуўшыся, Міхась прабівае сваім целам зямлянку, якой ён нібыта, як і дыму, не заўважыў стоячы доле і ў якой яго чакаў незнаёмы (ну, вядома, шпіён).

Наіўнае і сцвярджэнне аўтара пра тое, як піонер Міхась вёў незнаёмага: «Незнаёмы ішоў уперадзі (трэба: папераду) і стараўся завесці Міхася ў балота, але той, добра ведаючы мясцовасць, даваў загады і незнаёмы павінен быў падпарадкавацца».

Калі-б гэта было сказана пра лес, дык можна-б падумаць, што незнаёмы хацеў уцячы, а ў балоце можна толькі ўтапіцца хіба. Наогул-жа сказ бездапаможны, не кажучы ўжо пра непраўдзівасць таго, што шпіён баяўся піонера, хлапчука, якому ўсяго трынаццаць год, і падпарадкоўваўся яго загадам.

З агульнай масы рукапісаў можна вылучыць па наяўнасці пачуцця, па адчуванню слова і ўменню да цікавай пабудовы, па жаданню цікава намаляваць характары, творы В. Змітрэнкі (Брагінскі раён), Міколы Аўрамчыка (Бабруйскі раён), М. Прахарэвіча (Слуцкі раён), Фінкевіча (Глускі раён), І. Мурашкі (Менск).

Апавяданне В. Змітрэнкі «У сарочым рагу» выгодна адрозніваецца ад усіх іншых сваёю сціпласцю, прастатою і праўдзівасцю. Аўтар любоўна адчувае прыроду. Але і тут ёсць непаваротлівасць у пабудове сказаў, жаданне змясціць усё ў адным сказе. У апавяданні ёсць сказ: «Недалёка выразна шумеў дождж, рухаючыся наперад цэлаю сцяною». Калі-б аўтар сказаў проста: «Недалёка выразна шумеў дождж», дык гэта было-б не дрэнна, калі ж ён яшчэ дадаў: «рухаючыся наперад цэлаю сцяною», дык сапсаваў увесь сказ. Дождж шуміць, гэта праўда, але калі адначасова яго параўнаць са сцяною, якая рухаецца (?!), тады вы шуму яго не пачуеце.

М. Аўрамчыка наведала ўдзячная тэма, якая пры належным вырашэнні яе магла-б даць магчымасць чытачу прачытаць цікавае апавяданне. Аўтар выбраў і добрую назву, якая адпавядала-б твору пры належным падыходзе да тэмы. «На беразе возера» гучала-б цёпла і лірычна, калі-б аўтар паставіў сабе заданне напісаць апавяданне пра каханне паміж Алесем і дзяўчынаю — цыганкаю Зандаю. Аўтар зрабіў нават палову справы, ён даў завязку (псіхалагічную) і з лірычнай рамкі, як жывыя, глядзяць на чытача юныя палюбоўнікі Алесь і Занда. Але аўтар раптам рэзка абрывае твор, бо ён убачыў нейкага незнаёмага, які нешта запісваў на беразе возера. Тады знікнула каханне, зніклі Алесь і Занда і аўтара забралі ў палон схема і штамп. А шкада, магло-б выйсці добрае апавяданне.

Калі-б М. Прахарэвічу ставала агульнай граматнасці, дык яго апавяданне «Майскае ночы» магло-б з'явіцца ўзорам для шмат якіх пачынаючых, якія балай выключна пішуць цяпер пра адно: пра змаганне з парушальнікамі граніцы, шпіёнамі і дыверсантамі. Апавяданне пабудавана вельмі складна, няма тут лішніх людзей, няма неапраўданых учынкаў, аўтару вядома неабходнасць у творы інтрыгі. У яго цікавая народная пабудова сказаў. І толькі адна бяда: недастатковы ўзровень пісьменнасці. Калі аўтар здолее папрацаваць апавяданне паводле дадзеных яму заўваг, апавяданне можна будзе друкаваць.

Здольны малады аўтар і Фінкевіч, але яго вялікі недахоп—няўменне яшчэ па дробязі вылучаць характэрнае і таму ў яго часта вельмі поўна слоў там, дзе іх патрэбна вельмі мала.

Асобна і больш трэба спыніцца на аповесці І. Мурашкі «Лес шумеў». Тэма аповесці — партызанскі рух і барацьба сялянства супроць белапалякаў у 1919-20 годзе. Аповесць напісана добраю народнаю сакавітаю моваю, праўда, не ўсюды вытрыманаю, бо яшчэ трапляюцца публіцыстычныя месцы. Гэты твор рэзка адрозніваецца ад рэшты паказаных мною. Тут намаляваны характары, аўтару вядома пачуццё здаровага гумару, ён разумее ролю дэталі, адчувае прыроду. Не ўхіляецца ён і ад матыву народнае казкі, трапна карыстаючыся ім у патрэбных выпадках.

Я дазволю сабе падаць некалькі, можа крыху вялікіх, вытрымак з аповесці «Лес шумеў».

«Дзед Язэп не спяшаючыся пасоўваецца наперад. Дый спяшацца яму няма куды і няма чаго. Дома малыя дзеці не плачуць, а Тэкля як відаць спаць лягла. Прыемна дзеду паслухаць, як шуміць лес ад лёгкага ледзь прыкметнага ветрыка. Тралюе ён з Чорнай Лужы, куды адвозіў Юстына. Каб скараціць час, дзед пусціўся дахаты нацянькі... У лесе ён адчуваў сябе, як дома. Не раз, калі быў маладзейшы, лавілі яго з грыбамі ляснікі пана Лявіцкага. Грыбы адбіралі, а яго, ухлеіўшы па карку, праганялі з лесу... Хаця не баіцца дзед Язэп хадзіць па лесе, але на ўсякі выпадак у руцэ добрая ядлоўцавая палка. Палка ўласнай вытворчасці. Калісь у маладосці гэтай самай палкай Язэп на кірмашы ў Харужанцах звярнуў Ерчаку нос на бок».

«Хацеў і ён зайсці на кухню, але ў парозе яго сустрэў надзьмуты, як індык, легіянер.

— Што хэш, стары? Двадзесце пенць гароншых?

— Няхай табе двадзесце пенць скул сядзе, — вылаяўся Язэп, накіроўваючыся да панскіх пакояў».

«Сам Янка маленькі і доля яго маленькая, ды ў дадатак яшчэ і чорная. Яму ўсяго дзесяць год, з іх два гады ён на службе — пасе каровы. Там той год служыў у Ерчака, летась — у Максіма, а сёлета служыць у пані Лявіцкай».

«Кароткія ўлетку ночы. Таму і сон такі моцны. Спіць маёнтак пана Лявіцкага. Нішто не парушае яго сон. На стайні непакойны конь зрэдку глуха тупне капытом аб падлогу і зноў усё ціха. Толькі вакол свірна нячутнымі крокамі ходзіць вартавы. Яму таксама хочацца спаць. Вочы зліпае сон. Галава хіліцца долу. А спаць нельга: трэба вартаваць. І вартавы ходзіць, ходзіць. Следам за ім, як неадчэпная муха, ходзіць сон. Легіянер, стомлены хадою, садзіцца ля дзвярэй свірна, кладзе побач стрэльбу і, схіліўшы галаву на рукі, засынае. Але чаму-ж так ціха? Чаму не брэшуць панскія сабакі?»

«...Ноч. Цемра... Усё спіць наўкол... Але не, не ўсё: вакол панскіх будынкаў шнуруюць маўклівыя цені, нібы здані ўздумалі ладзіць у панскім маёнтку сваю таямнічую гульню. Яны сыходзяцца, разыходзяцца, знікаюць, з'яўляюцца зноў. Дваяцца, траяцца... Дзе сядзеў вартавы, там сядзяць тры цені і ледзь чуецца стогн».

«У адным з пакояў партызаны натрапілі на Караліну — сястру пана Лявіцкага, якая служыла ў польскай арміі і цяпер гасцявала дома. Яна ляжала ў непрытомнасці.

— Цьфу! — плюнуў на яе Тодар і сказаў:

— Загалілася да пупа, аж сорам глядзець».

«А дзе-ж пан? — пыталіся нядаўнія вязні.

— Цела тут, а душа ў рай паляцела, — жартавалі ў адказ партызаны».

«— Не жадаў, паскуда, ісці, — гаварыў Міхалка, які разам з другімі хадзіў па Максіма. — Прасілі мы яго і так і сяк, а ён уплёўся ў вушак, як клешч у сабачы хвост, і ні з месца... Давялося дзьмухнуць разы са два па карку, тады толькі паслухаўся — пайшоў».

Няхай даруе мне чытач за гэтае доўгае адступленне, але напэўна ён не будзе ў прэтэнзіі, калі прачытае падобныя вытрымкі з аповесці І. Мурашкі «Лес шумеў».

Праўда, аповесць яшчэ да друку не варта, хоць у нас друкаваліся і горшыя рэчы, але пры далейшай перапрацоўцы яе аўтарам можа быць надрукавана ў літаратурна-мастацкім журнале.

У заключэнне я павінен сказаць у якасці маёй парады пачынаючым аўтарам:

— Чым мацней будуць звязаны паміж сабой вашы героі, тым цікавейшымі будуць іх учынкі і тыя падзеі, якія будуць вынікаць з іхніх учынкаў. І калі нават выкінеце частку з апавядання, дык каб можна было адразу ўбачыць, што ў ім нестае часткі, альбо калі-б прачытаў гэтую частку, дык каб убачыў, што гэта частка нейкага апавядання, а не самастойны малюнак альбо эпізод, зусім не звязаны арганічна з творам. Больш канкрэтнасці і жвавасці і менш слоў. Апранайце касцяк твора ў прыгожую слоўную тканіну, бо твор усё адно як жывая істота, якая апрача касцей павінна мець і мяса, і скуру, і валасы. Чытайце класікаў, чытайце лепшых сучасных пісьменнікаў. Вывучайце мову народа, вывучайце народную творчасць—казкі, прыказкі, песні. Калі вы не адмовіцеся прыняць гэтыя парады, вы будзеце пісьменнікамі, вы будзеце пісаць цікавыя, прыгожыя мастацкія творы.

Р. МУРАШКА.



Кадр з фільма «11 ліпеня». Маці (заслужаная арт. рэс. ДАМАШЭВА) ля цела забітага белапалякамі Янкі (арт. ПЛУЖНІК).



Кадр з фільма «11 ліпеня». Маці (заслужаная арт. рэсп. ДАМАШЭВА), жандар (арт. ЧЭХАЎСКОЙ).

ФІЛЬМ АБ БЕЛАПОЛЬСКАЙ АКУПАЦЫІ

(«11 ЛІПЕНЯ» — ВЫТВОРЧАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ КІНО-СТУДЫІ «СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»)

Неўзабаве беларуская кінематаграфія будзе налічваць пятнаццаць год сваёй работы. Будзе падведзен нейкі вынік, які не цяжка ўжо прадбачыць. Ужо зараз з вялікім жалем можна канстатаваць нейкі крыўдны і цяжкі правал з вырашэннем тэм, ажыццяўляць якія была заклікана іменна беларуская кінематаграфія. Гэты правал выключна войстра адчуваецца ў вырашэнні тэм аб сёнешняй Совецкай Беларусі, але не менш войстра ён адчуваецца і ў паказе гераічнай барацьбы беларускага народа са сваім адвечным ворагам—польскімі інтэрвентамі. Праўда, было некалькі спроб паказаць гэту барацьбу, але ні адна з іх не адлюстравала глыбокага гістарычнага сэнсу падзей. Гэту тэму беларуская кінематаграфія абавязана вырашаць нанава, абавязана ствараць сапраўдныя, вялікай мастацкай сілы фільмы аб гераічных годах барацьбы з белапольскай інтэрвенцыяй.

1938 год у гэтых адносінах мае некаторы зрух. Іменна ў гэтым годзе будуць выпушчаны два вялікіх фільмы аб барацьбе з польскай інтэрвенцыяй на Беларусі. Адзін з іх—«11 ліпеня» (пастаноўка заслужанага дзеяча мастацтваў Ю. Тарыча, сцэнарый Зеновіна і Тарыча) ўжо начарна закончан. Другі—«Вогненыя годы» яшчэ толькі пушчан у вытворчасць.

Аб карціне «11 ліпеня» можна ўжо гаварыць як аб цэльным закончаным творы, які ў бліжэйшыя дні глядач убачыць на экранах.

Паклаўшы ў аснову гістарычную праўду, аўтары пачалі дзеянне фільма з існаваўшага на пэўным этапе вайны стратэгічнага становішча фронтаў. Для Чырвонай Арміі гэта становішча было цяжкім. Пад ударамі польскіх часцей, перавышаючых нас колькасцю і сілаю ўзбраення, Чырвоная Армія вымушана была адступаць. Фільм і пачынаецца адступленнем часці Чырвонай Арміі, абараняўшай Ігумен. Начдзіў Кузьміч, аддаўшы апошнія распараджэнні, пакідае мястэчка апошнім. Апусцеўшае мястэчка прыталілася ў цяжкім чаканні белапольскіх катаў.

Але сіла Чырвонай Арміі заключалася яшчэ і ў тым, што яна была і ёсць сапраўды народнай арміяй. Яна ніколі не была адарвана ад народных мас, дапамагаўшых ёй перамагаць ворага. Пакідаючы Ігумен, камандванне дывізіі ведала, што на тэрыторыі акупіраванай палякамі, застаюцца магутныя захаваныя рэзервы беларускага народа, азлобленага супроць акупантаў. Гэтыя рэзервы трэба было толькі арганізаваць. Для гэтай мэты камандванне дывізіі пакідае ў мястэчку Сцяпана Паўлюка і прысланага ў армію ЦК партыі большэвікоў Беларусі рабочага Гарановіча. З гэтай часткі фільма пачынае развівацца цікавая тэма аб партызанскім руху на Беларусі супроць польскіх акупантаў Чотка і ясна бачачы канчатковую мэту барацьбы з белапалякамі, беларускія партызанскія масы не заўсёды ясна ўяўлялі сабе металы гэтай барацьбы Некаторая частка партызанаў разумела гэту барацьбу як абарону сваёй вёскі.

Гісторыя партызанскага руху налічвае нямала трагічных фактаў гэтай гістарычнай памылкі. Крывавыя лапы польскіх катаў бязлітасна душылі слабыя партызанскія жменькі асобных вёсак, Партыя паставіла задачу—зліць у што-б там ні стала маленькія групкі партызанаў у буйныя атрады і аб'яднаць іх дзеянні з задачамі фронта. Сцяпан і Гарановіч сабралі распыленыя сілы партызанаў і натхнілі іх адзінай мэтай барацьбы. Праўда, гэта было не так лёгка зрабіць. Янка -брат Сцяпана, арганізаваў вакол сябе анархічную частку партызанаў і стаў сур'ёзнай перашкодай Сцяпану і Гарановічу ў справе аб'яднання партызанскіх сіл. На вёску прыехаў польскі атрад за падводамі. Янка хацеў узняць усю вёску і прагнаць атрад. Сцяпан і Гарановіч утрымалі людзей за сабой і павялі іх у лес.

У Янкі засталася адзіная надзея на шпіёна Капусту. Да яго кінуўся Янка за дапамогай супроць белапалякаў. Капуста даўно ўжо пераконваў Янку выдаць партызанаў на чале са Сцяпанам і зараз Капуста проста заявіў, што калі Янка скажа, дзе Сцяпан і партызаны,—палякі нікога не крануць. Толькі зараз Янка зразумеў, што ён меў справу з гнюснейшым нацдэмаўскім здраднікам. Янка не выдаў. Але выдаў іх кулацкі шпіён Баравік, які прабраўся па заданню дыфензывы ў партызанскі атрад. Янка выперадзіў польскі карны атрад і толькі паспеў папярэдзіць партызанаў аб бядзе. Але было ўжо позна. Палякі замкнулі лес у кальцо. Цаною гераічных намаганняў Сцяпану і Гарановічу ўдалося выратаваць большую частку свайго атрада. Янка загінуў у баі. Але не дарэмна ён аддаў сваё жыццё. У рукапашнай схватцы ён укрыў вакол сябе зямлю трупамі польскіх салдатаў І толькі палахлівая куля польскага афіцэра прыкончыла гэта буйнае жыццё. Азвярэўшыя польскія бандыты пачалі помсціць вёскам.

Пад плач дзяцей і жанчын палякі гоняць нарабаваную жывёлу, паляць вёскі. Садызм польскіх жандараў не ведае межаў. Сагнаўшы ў адну хату ўсіх дзяўчат з усёй вёскі, салдаты прымушаюць іх танцаваць з імі ў той час, калі за вокнамі палаюць двары, стогнуць забіваемыя бацькі і мацеры іх. Эпізод вечарынкі польскіх салдатаў пакідае незабыўнае ўражанне. Спецыяльна напісаная да яго кампазітарам Васілём Седым музыка яшчэ больш абвастрае гэта ўражанне.

Звярыная злаба польскіх жандараў, душыўшых безабаронных старых і дзяцей у акупіраваных вёсках, была аднакай не сілы, а слабасці польскага фронта. Аправіўшыся ад першых удараў, Чырвоная Армія, падмацаваная падаспеўшымі часцямі з іншых франтоў Совецкай Расіі, пераходзіць у контрнаступленне. Грозная лава чырвоных часцей перакідваецца праз Беразіну. Вось для гэтага рашучага ўдару Сцяпан і Гарановіч накаплівалі партызанскія сілы. Сцяпан і Гарановіч атрымліваюць ад камандавання дывізіі заданне ліквідаваць агонь польскіх батарэй. Смелай і ўдалай вылазкай з тылу атрад Сцяпана захоплівае польскія батарэі, трымаўшыя пад сакрушальным агнём наступаючыя часці Чырвонай Арміі. Дывізія прарывае польскі фронт. Камдзіў Кузьміч паранен. Сцяпан прымае камандванне дывізіяй на сябе і вядзе наступленне на Менск. Палякі ў панічным адступленні пакідаюць разграблены Менск. З якой невыказнай радасцю і лікаваннем сустракаюць працоўныя будучай сталіцы Совецкай Беларусі Чырвоную Армію. Праход уступіўшай у Менск Чырвонай Арміі і партызанаў праз плошчу ператвараецца ў грандыёзны парад вызваліцеляў. Апафеозам народнага лікавання заканчваецца фільм, ажывіўшы ў памяці народа трагічныя дні крывавага нашэсця польскіх інтэрвентаў.

Фільм «11 ліпеня» толькі ўмоўна можна назваць гістарычным, паколькі тэма і вобразы ўзяты з падзей, маючых параўнальную даўнасць. Па сутнасці-ж карціна выключна сучасная і актуальная, калі яе расцэньваць з пункту гледжання абвайстраючайся пагрозы новай фашысцкай інтэрвенцыі. Яна яшчэ раз напомніць ворагам, што беларускі народ і ў далейшым будзе з такой-жа бязлітаснасцю граміць усякага, хто пасягне на яго свяшчэнную радзіму. Тут, бадай, самая важнейшая заслуга аўтараў, здолеўшых ярка правесці гэту думку з пачатку да канца фільма.

Да ліку недахопаў карціны трэба аднесці няўладжанасць сюжэтнай канструкцыі. Дзеянне развіваецца вялым апавядальным тэмпам, аслабленым за лік цэлага раду другарадных эпізодаў, сцэн і вобразаў, не абавязковых для асноўнага дзеяння. Можа быць, таму некаторыя вобразы фільма пакідаюць уражанне чарнавых накідаў сцэнарнага замыслу, не распрацаваных паслядоўна і глыбока. У карціне іх можна налічыць нямала: Таня, Дрозд, дзед Аўлос, Марылька, Кулік. Усе яны ніяк не патрапляюць, ці проста не ўмяшчаюцца ў асноўную магістраль сюжэтнага цячэння. А па замыслу яны выключна цікавыя вобразы. Кулік, напрыклад, стары ваенспец. Пры наступленні палякаў ён прышоў да камдзіва і проста заявіў аб сваім жаданні чэсна паслужыць радзіме ў справе абароны яе ад інтэрвентаў. Кулік стаў начальнікам штаба партызанскага атрада. Калі палякі абкружылі лагер партызанаў — Кулік гіне геройскай смерцю, узарваўшы гранатамі афіцэра Капусту і сябе ў зямлянцы.

Усе гэтыя ўчынкі Куліка, вядома, правільныя і законамерныя. Але зроблена гэта вельмі схематычна, непераканальна і павярхоўна. Невыразнымі і цмянымі мазкамі дадзен рух вобразаў Тані, Марылькі. Яны больш прысутнічаюць пры падзеях, чым удзельнічаюць у іх. А ў замысле Таня і Марылька зноў-такі задуманы цікава. Таня — жонка Сцяпана, працуе ў падзіве. Тут можна і трэба было паказаць, паколькі гэта дапусціма было суадносінамі вобразаў, гераічны вобраз жанчыны-ўдзельніцы грамадзянскай вайны. Гераічны вобраз не атрымаўся, не глядзячы на цудоўную магчымасць для гэтага ў карціне. Таня выконвала небяспечнейшыя заданні камандвання дывізіі. Яна пранікала з фронта ў тыл белапалякаў і трымала сувязь паміж камандваннем дывізіі і партызанскімі атрадамі. У карціне, між іншым, гэта выключна гераічная работа Тані таксама не паказана пераканальна і глыбока.

Безумоўна, не абавязкова ўзнімаць кожны эпізадычны вобраз на адзін узровень з асноўнымі. Можа, таму і не так прыкметны адзначаныя недахопы.


Сцэны масавага боя пры наступленні Чырвонай Арміі паказаны з выключным рэжысёрскім майстэрствам і пакідаюць глыбокае ўражанне. Фінал фільма гучыць як урачыстасць пераможнай барацьбы. Тут неабходна адзначыць выдатную музыку кампазітара Васілія Седога, якая надае карціне высокі эмацыянальны тон. Ярка запамінаецца музыка ў сцэне прыходу маці да цела забітага Янкі, музыка вечарынкі польскіх салдатаў, партызанская песня, праходзячая лейтматывам у карціне. Уся музыка Седога, за выключэннем хіба песні дзяўчат, надае дзеянню войстрае напружанае хваляванне.

Фільм «11 ліпеня», бадай, першая ўдача рэжысёра Ю. Тарыча пасля некалькіх няўдалых карцін, пастаўленых ім за апошнія некалькі год.

Здымаў карціну аператар С. Іваноў, гукааператар — Б. Каранькоў.

У карціне здымаліся: засл. арт. рэсп. Анненскі (Сцяпан), арт. К. Рутштэйн (Гарановіч), засл. арт. рэсп. Камароў (Капуста), арт. Плужнік (Янка), засл. арт. рэсп Дамашэва (маці), арт. Інюціна (Таня) і інш.

К. ГУБАРЭВІЧ.



12 ліпеня працоўныя гор. Менска святкавалі XVIII гадавіну вызвалення Беларусі ад белапольскай акупацыі.

Вечарам на стадыёне «Дынамо» адбылося фізкультурнае свята.

НА ЗДЫМКУ: парад удзельнікаў фізкультурных выступленняў. На чале калоны менская футбольная каманда ордэнаноснага таварыства «Дынамо».

(Саюзфота).

НАРОДНАЕ МАЙСТЭРСТВА

(Заметкі аб алімпіядзе хлебапёкаў)

Аб мінулым жыцці рускіх хлебапёкаў Максім Горкі напісаў шырокавядомае апавяданне «26 і адна». Усмешка не ўзнікла на твары пекара, вясёлыя песні і смех былі яму чужыя. Цэлымі суткамі прападаў ён каля гарачых пячэй, задыхаючыся ад спёкі і валячыся з ног ад недасыпання. Горкі бясcмертнымі радкамі намаляваў карціну «гарачай катаргі» і яго апавяданне па сёнешні дзень з вялікім хваляваннем чытаюць тысячы. Ён пераканальней за ўсякія словы ўваскрашае ў памяці беззваротнае мінулае.

Са сцэны канферансье абвяшчае, аб выступленні музыкальнай сям'і Ліфшыц. Гэта не прафесіянальныя артысты. Шолам Ліфшыц, кіраўнік гэтага незвычайнага аркестра — майстар-хлебапёк. Яму 40 год. З іх 26 ён аддаў працы. Давялося яму працаваць і ў тых умовах, у якіх калісьці працаваў малады Горкі: спаць на мяшках з мукой, суткамі не вылазіць з напоўцёмнага сутарэння пякарні, выносіць жорсткія пабоі. Якое шчасце, што перажытае адышло ў мінулае!

Аб тым, як зараз жыве Ліфшыц, як жывуць яго таварышы па працы, расказала яго выступленне. Яно было бясслоўным. Гаварыла музыка.

На сцэну выйшаў Шолам Ліфшыц і побач з ім — яго таленавітыя дзеці. Стройненькі Яша. Яму дзевяць год. Як самае каштоўнае, прыціскаў ён да грудзей любімую скрыпку. З 6-ці год Яша падружыў з ёю. Любоў да скрыпкі прывіў яму хлебапёк-бацька. Шолам сам іграе на скрыпцы. Сярэдні сын Абраша іграе на раялі. Некалькі год назад у дом Ліфшыца ўнеслі важкі інструмент. Гэта быў незабыўны дзень у сям'і бабруйскага харчавіка-хлебапёка. Ці маглі раней рабочыя-пекары марыць аб такой пакупцы?

З таго часу, калі ў доме паявіўся інструмент, Абраша ўвесь вольны час праводзіць ля раяля. Музыкант па натуры, Ліфшыц і ў трэцяга сына, старэйшага 15-гадовага Моні, абудзіў інтарэс да музыкі. Моня трубач.

І вось яны ўсёй сям'ёй выступаюць на алімпіядзе мастацкай самадзейнасці беларускіх хлебапёкаў. Выступаюць са сцэны вялікага клуба.

Строгі да самога сябе, Ліфшыц патрабуе і ад дзяцей сур'ёзных адносін да музыкі. Яша і Абраша ўжо некалькі год займаюцца ў Бабруйскім музыкальным вучылішчы. Іх выступленне на алімпіядзе служыла як-бы публічным экзаменам пройдзенага. І рэбята вытрымалі гэты экзамен. Пасля калектыўнага выканання ўсім аркестрам некалькіх папулярных твораў совецкіх кампазітараў, дзеці ігралі складаныя класічныя рэчы. Абраша на піяніна, Яша на скрыпцы. У іх, бясспрэчна, вялікія здольнасці, яны паказалі добрую тэхніку, глыбокае разуменне сутнасці выконваемай рэчы.

Бацька гэтай музыкальнай сям'і цэніць сур'ёзныя адносіны дзяцей да музыкі і ўсяляк заахвочвае іх цягу да ігры. Сам ён таксама свой вольны час аддае музыцы. Аднойчы Шолам Ліфшыц выступаў на ўсесаюзнай алімпіядзе. Поспех, якім ён там карыстаўся, прымусіў яго больш сур'ёзна працаваць над сабой.

На алімпіядзе хлебапёкаў выступала яшчэ адна сям'я, праўда, у меншым складзе — бацька і дачка Пазднякозы. Пазднякоў—майстар гомельскага хлебазавода. Ён і дачка спяваюць. У дачкі прыгожы меладычны голас, праўда, яшчэ недастаткова акрэплы. Яны выконвалі народныя песні («Вдоль по улице метелица метет» і інш.), масавыя совецкія песні («Если завтра война» і інш.). Гэта было адно з цікавейшых выступленняў на алімпіядзе.

На алімпіядзе хлебапёкаў былі прадстаўлены ўсе жанры мастацтва. Віцебскі драматычны гурток паказаў трэці акт камедыі Гогаля «Жаніцьба». Гоголь аказаўся па сіле рабочаму драматычнаму гуртку. Ужо сам сабе гэты факт шмат значыць!

Былі прадстаўлены на алімпіядзе і танцоры. У асноўным іх рэпертуар складаўся з народных танцаў. Вельмі добра выканалі беларускі народны танец «Янку-польку» менскія хлебапёкі, суправаджаючы танец песняй: «Янка сее кавуны, а я журавіны».

На другую алімпіяду ў Менск прыязджала да ста пекароў. Алімпіяда паказала вялікі рост самадзейнага мастацтва пекароў.

Весела жывецца совецкім хлебапёкам. Як-жа не спяваць, не іграць ім у наш цудоўны час!

Е. САДОУСКІ.

ДРУГАЯ АЛІМПІЯДА ПРАЦКАЛОНІЙ НКВД

З 11 па 13 ліпеня ў Менску праходзіла другая алімпіяда самадзейнага мастацтва працкалоній НКВД БССР. Самадзейнасць Віцебскай і Магілеўскай працкалоній паказала, што ў калоніях праводзіцца вялікая выхаваўчая работа. Былыя малалетнія злачынцы перавыхоўваюцца і дзякуючы соцыялістычнай працы становяцца свядомымі совецкімі грамадзянамі.

З шматлікіх удзельнікаў алімпіяды асабліва вылучаюцца калектыў Віцебскай працкалоніі, які паказаў літмантаж па паэме Э. Багрыцкага «Дума пра Апанаса», пастаўлены артыстам Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра А. П. Беналіпецкім, і духавы аркестр Магілеўскай працкалоніі пад кіраўніцтвам Суслава.

Цікавыя музычныя творы напісаны і выкананы на раялі самавучкай-музыкантам выхаванцам Магілеўскай працкалоніі Цеплянікам.

Сярод выступаючых было шмат музыкантаў, чытальнікаў, фізкультурнікаў, што сведчыць аб рознастайных здольнасцях выхаванцаў.



Летні кінотэатр парка культуры і адпачынку імя Горкага ў Менску.

Зарысоўка М. Гурло.

ЦЫРК

АКРАБАТЫЧНАЕ МАЙСТЭРСТВА

У другой праграме цыркавога прадстаўлення вядучае месца займае акрабатычнае мастацтва. У пераважнай большасці прадстаўнікі гэтай групы—моладзь. Актары дэманструюць не толькі цыркавую тэхніку акрабатыкі, а разам з тым, паказваюць спрытнасць і сілу цыркачоў, прыгожасць цела і рухаў, пластычнасць і выключную вытрымку артыстаў цырка. Яны любоўна робяць свае нумары, чыста і культурна падносяць іх гледачу, што з'яўляецца ўдалай і нагляднай агітацыяй і прапагандай фізкультуры.

Група Юллі — акрабаты з пераходнай лесвіцай — прадэманстравалі перад гледачом выключную тэхніку, спакой і дасканаласць свайго мастацтва. Асабліва бездакорна працуе мужчынскі склад гэтай групы. Два артысты, якія працуюць угары, чыста робяць стойкі на галаве і руках. Актор, які працуе ўнізе, валодае добрай тэхнікай балансу цела, што значна аблягчае работу акторам угары і дапамагае стварыць такі складаны нумар, як трохпавярховая піраміда і пераход з ёй праз лесвіцу.

Да групы акрабатаў, якія дасканала валодаюць сваёй тэхнікай, трэба аднесці эквілібрыстаў Раевых і акрабатаў на паветраным п'едэстале Дэсмонд. Але калі цыркач хоча насіць ганаровае званне артыста, ён павінен быць яшчэ і мастаком. Для гэтага неабходна, каб кожнае выступленне акрабатычнай групы мела пэўны мастацкі сэнс. Выступленне-ж Раевых носіць некаторы хаотычны характар.

Для пацвярджэння нашай думкі возьмем іншых удзельнікаў гэтай-жа праграмы, прадстаўнікоў мастацкай акрабатыкі. Цветковы задумалі пабудаваць сваё выступленне ў выглядзе акрабатычнага эцюда. Першая іх спроба безумоўна ўдалая. Не гледзячы на некаторую тэхнічную недасканаласць, на адсутнасць пэўнай паслядоўнасці руху паміж акрабатычнымі нумарамі, усё-ж мастацкае зярно ў іх выступленні ёсць. Найбольш поўнымі і мастацка спелымі былі выступленні мастацкай групы акрабатаў Аркатавых. Тут ужо ёсць пэўны стыль. Іх піраміды скульптурныя, прыгожыя і складаныя па свайму стылістычнаму малюнку і не толькі не выпадаюць, а, наадварот, увесь час трапна спалучаюцца з рухамі, якія досыць асэнсаваны. Гэтай групе можна было-б параіць стварыць сюжэтнае акрабатычнае выступленне. Гэта далейшая ступень, якой неабходна авалодаць артыстам групы Аркатавых.

У цырку ўсё яшчэ пануе мода, калі акторы больш клапоцяцца аб вонкавым афармленні нумара. Не ў папрок кажучы Валенціне і Міхасю Волгіным, іх атракцыён таксама ў гэтым грэшны. Які сэнс атракцыёна «лятаючая тарпеда»? На нашу думку — рызыка. А хацелася-б бачыць спрытнасць, гібкасць цела, прыгожасць фігур паветровых гімнастаў. Усё гэта ўвогуле ў іх ёсць, але неяк няярка выпуклена ў іх выступленнях.

Палёты з амерыканскага трампліна артыстаў Сіж некалькі аднастайныя, адсутнічае вынаходлівасць. Работа клоўнаў у гэтым нумары трафарэтная.

У рознастайнавай праграме, якая па сваёй якасці стаіць значна вышэй тых праграм, што часта нам паказвае цырк, дробных недахопаў глядач амаль не заўважае, таму такім вялікім поспехам карыстаецца другая праграма цыркавога прадстаўлення.

Глядач не можа быць роўнадушным да такога аптымістычнага, жартаўлівага і выключна таленавітага жанглёра, як Махлін, з якім мы знаёмы па фільму «Цырк». Асаблівасць гэтага жанглёра ў тым, што ён увесь час свайго выступлення імкнецца падтрымліваць жывую сувязь з гледачом. Надзвычай добра актор жангліруе мячыкамі. Яго нумар значна ажыўляе праграму.

Выступленне дрэсіроўшчыка Хурсанава таксама пакідае нядрэннае ўражанне.

І нарэшце, трэба сказаць аб тых, каго так часта мы крытыкуем у друку, — аб гумарыстах і клоунах. На вялікі жаль, і ў дадзеным выпадку мы павінны сказаць, што Ражноўскі і Скалаў, не гледзячы на злобадзённасць літаратурнага матэрыялу, выконваюць куплеты далёка не мастацка. Рэчытатывы без характарных інтанацый не заўсёды даходзяць да гледача. Акторы спадзяюцца на тэкст, які мае некалькі астрот, літаратурная каштоўнасць якіх усё-ж нізкаякасная.

Клоун Сенічка Рэдзькін працуе ля дывана. Ён павінен займаць публіку паміж нумарамі. Нам здаецца, што Рэдзькін хоць і не зусім, але ў меру сіл сваіх з гэтай задачай спраўляецца. Праўда, іншы раз ён жартуе плоска, неразумна. Затое Рэдзькін не капіруе клоунскіх масак, а сам стварае арыгінальны тып клоуна. Гэта значыць, што думка актора накіравана ў творчае русла. Такія жарты, як выпадак з барометрам, прысвойванне сабацы мянушкі, гутарка па тэлефону, безумоўна з'яўляюцца змястоўнымі жартамі і іх варта культывіраваць у цырку.

Другая праграма цырка, якая дэманстрыруе ў асноўным майстэрства акрабатаў, складзена з цікавых нумароў. Трэба пажадаць, каб і ў далейшым былі такія-ж рознастайныя праграмы, як гэта.

А. СОКАЛАЎ.

У Філармоніі БССР

15 мая ў Жэлезнаводску пачаў свае гастролі **сімфанічны аркестр**, якім кіруе галоўны дырыжор музыкі. З'ява выхаду аркестра на ўсесаюзную арэну з'яўляецца фактам вялікай палітычнай важнасці. 30 чэрвеня на канферэнцыі слухачоў наш сімфанічны калектыў атрымаў добрую ацэнку. Аркестр пазнаёміў насельніцтва Жэлезнаводска з сімфанічнымі творамі беларускіх кампазітараў — «Рапсодыяй на беларускія тэмы» і фантазіяй — Туранкова, з «Яўрэйскай рапсодыяй», «Першай сімфоніяй» і «Харaводнай» — Залатарова, з «Капрычыо» Аладава і творамі Палкавырава і Чуркіна. З сучасных кампазітараў СССР аркестр выконвае сімфоніі, уверцюры і ўрыўкі з оперных твораў Гліера, Хачатур'яна, Мяскоўскага, Жэлабінскага, Рэвуцкага, Кніпера, Леташынскага. У канцэртах адводзіцца вялікае месца сімфанічнай творчасці рускіх і заходне-еўрапейскіх класікаў: Глінку, Барадзіну, Рымскаму-Корсакаву, Мусаргскаму, Бетховену, Моцарту, Вагнеру і Лісту.

Сімфанічны аркестр Дзяржаўнай філармоніі БССР прабудзе ў Жэлезнаводску да 15 верасня.

Вярнуўся з гастролей **ансамбль беларускай народнай песні і пляскі.** 33 канцэрты ўдзельнікі ансамбля далі рабочым, чырвонаармейцам і калгаснікам Віцебска, Оршы, Полацка, Быхава, Крупак. Асабліва радасна сустрэлі актораў у калгасе «Перамога» Быхаўскага раёна. Пры сустрэчы калгаснікі праспявалі беларускую народную песню «Ходзе міленькі лужочкам». Песня гэта ўключана ў рэпертуар ансамбля. Запяваць яе будзе 80-гадовая калгасніца калгаса «Перамога» Вольга Цыркунова, якая зараз прынята ў хор ансамбля. Кіраўнік ансамбля кампазітар тав Сакалоўскі ў часе гастролей запісаў некалькі новых беларускіх песень. У калгасах «Новы свет» і імя Сталіна, Крупскага раёна, ім запісана песня «Сенакосная» — ад 65-гадовай Вольгі Гвоздзік і беларуская народная песня «Каліна-малінушка». У вёсцы Вораны Рудзенскага сельсовета Віцебскай вобласці кампазітар запісаў вясельную песню «Ой сад зялёны», якая адрозніваецца ад ранейшых тужлівых вясельных беларускіх народных песень сваёй лірычнай цеплынёй і аптымістычнасцю настрояў.

У гастрольнай паездцы ансамбль выконваў песні: «Нашы дзяўчаты» — Туранкова, «Бывайце здаровы» — Любана, «А ў полі ніўка» — Равенскага, «Вдоль деревни» (руская) у апрацоўцы Захарава. Вялікім поспехам карысталіся народныя танцы ў пастаноўцы кіраўніка ансамбля балетмейстара Алексютовіча — «Бульба», «Юрачка», «Лявоніха».

Калектыў ансамбля папоўніўся ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці віцебскай фабрыкі імя Клары Цэткін. У ансамбль прынята чатыры чалавекі.

Хор Дзяржаўнай філармоніі сёлета працаваў у Гомелі, Магілеве, Рэчыцы, Жлобіне і Шклове. Ён выступаў пад кіраўніцтвам Бары і ўсюды карыстаўся поспехам. У Канстанцінаўцы (ля Гомеля) рабочыя буйнага шклозавода цёпла сустрэлі калектыў харыстаў і шчыра дзякавалі за выступленне.

Аркестр беларускіх народных інструментаў пад кіраваннем кампазітара Самохіна свой летні сезон правёў у Менску. Аркестр працуе зараз над новым рэпертуарам, у які ўключаны творы беларускіх кампазітараў— «Пастараль» і «Юрачка» з балета «...лавей» Крошнера, «Фантазія на беларускія песні» Цікоцкага, «Зара-ж мая вячэрняя» — беларуская народная песня ў апрацоўцы Залатарова, «Яўрэйская песня» Туранкова, «У садзе рэчанька» дуэт у апрацоўцы Аладава і інш.

ХОРГУРТОК КАЛГАСА „НОВЫ СВЕТ“

У 1937 годзе ў калгасе «Новы свет» Палужскага сельсовета Краснапольскага раёна быў арганізаван хоргурток. Першым у хоргурток уступілі сёстры Занудзенка Ліса і Наста, якія зараз з'яўляюцца кіраўнікамі гуртка.

У гуртку дзевяць чалавек. Усе яны працуюць у калгасе.

На раённай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці хоргурток атрымаў першынство і права ўдзельнічаць на ўсебеларускай і ўсесаюзнай алімпіядах калгаснай мастацкай самадзейнасці.

Песня гуртка «Свеціць сонца яснае» запісана ў Маскве на грамафонную пласцінку, яе часта перадаюць па радыёстанцыі імя Комінтэрна.

Хоргурток карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у раёне. У яго рэпертуары пераважна совецкія і народныя песні, танцы «Бульба» і «Юрачка». Асабліва добра выконвае гурток народную беларускую песню «Бывайце здаровы». Гурток правёў вялікую работу па абслугоўванню выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Трэба адзначыць, што як раённыя арганізацыі, так і Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР не кіруюць калгаснай мастацкай самадзейнасцю. Гэта відаць па іх адносінах да хоргуртка калгаса «Новы свет».

Неабходна газеце «Літаратура і Мастацтва» завесці аддзел пад загалоўкам: «Што мы пакажам на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве».

На дэкадзе трэба паказаць лепшую калгасную мастацкую самадзейнасць.

Я. ЛІФШЫЦ.

РАДЗІМА СПЯВАЕ

Музыка А. ТУРАНКОВА. Словы Г. НЕВЯДОМСКАГА.

(Масавая песня)



Радзіма гамоніць, радзіма спявае,
І музыка працы няспынна гучыць,
І песні ліюцца ад края да края
Аб радасным, светлым, заможным жыцці.

Ляцяць нашы песні адтуль, дзе заводы
Гамоняць машынамі, сталлю звіняць,
Адтуль, дзе рунеюць вясёлыя ўсходы,
Дзе зеленню ранняй блішчыць сенажаць.

У песнях гучыць наша радасць і шчасце,
Гучыць наша слава, адданасць, любоў
К таму, хто напоўніў радзіму багаццем,
Яе ўпрыгожыў заможным жыццём.

Ляціць наш напеў у блакітным прасторы,
Арліным палётам ляціць на ўвесь свет,
Туды, дзе палаюць крэмлёўскія зоры,
Дзе Сталін любімы і родны жыве.

Радзіма спявае, радзіма гамоніць
Ліецца ў прасторы напеў баявы:
— Няхай жыве Сталін, любімы і родны,
Няхай жыве наш дарагі правадыр!

АБ ДЖАЗЕ

Джазу ў нашай музыцы адведзена асобнае, вельмі пачэснае месца. Ворагі народа пад маскай «змагароў» за «чыстую» сімфанічную музыку спрабавалі выжыць джазавую музыку з нашай эстрады, крычалі аб непатрэбнасці, няпоўнацэннасці гэтага віду мастацтва. Гэтыя намаганні ворагаў народа, трацкісцка-бухарынскіх паследышаў былі сарваны. Джаз моцна ўкараніўся ў нашай музыцы, стаў адным з самых папулярнейшых і любімых сродкаў культурнага адпачынку працоўных нашай краіны.

У нас ужо ёсць нямала культурных джазавых ансамбляў, якія заваявалі сімпатыю і любоў гледачоў і слухачоў сваёй разумнай, своеасаблівай сапраўды джазаўскай трактоўкай музычнага матэрыялу, сваёй здольнасцю захоўваюць у сваім выкананні ўсю цеплыню «сапраўднай», сур'ёзнай музыкі, спалучаючы яе з тым своеасаблівым гумарам, які так уласцівы джазу.

Але-ж ёсць у нас нямала такіх джаз-аркестраў, якія пад выглядам «своеасаблівасці» падносяць слухачу пашляціну, самую нізкапробную халтуру, а часам простае ігнараванне элементарнейшай музыкальнай граматы.

Да ліку апошніх бясспрэчна належыць і джаз-аркестр, які выступае зараз у менскім кінотэатры «Чырвоная зорка».

Выступленні ансамбля канферыруе нейкі Пермыкін. Што агульнага мае гэта фігура з мастацтвам, з нашай эстрадай, цяжка сказаць.

Ад кожнага руху гэтага чалавека, ад яго ўхмылкі, ад яго жартаў—заўсёды адных і тых-жа — нясе нейкім глыбокім маральным разлажэннем. Адразу-ж відаць, што гэты чалавек даўно ўжо згубіў, растраціў усю сваю душэўную цеплыню, што ён выконвае свае нумары механічна, без усякага ўздыму. Лепшыя песні выдатнейшых совецкіх кампазітараў ён выконвае непрыемным, скрыпучым голасам ці, правільней, рэшткамі даўно ўжо прапітага голасу. Кожнае яго паяўленне на падмостках утварае на гледача цяжкое, гнятучае ўражанне.

Гэты чалавек, відаць, кладзе свой адбітак і на ўвесь аркестр. У выкананні нават самых эфектыўных нумароў адчуваецца нейкая сухасць, шэрасць, адсутнасць усякай творчай думкі, жаданне хутчэй «адстукаць» свае нумары і пазбавіцца ад публікі.

Танцавальныя нумары прадстаўлены толькі чачоткай у выключна бяздарным выкананні артыста джаза Сашы Золава.

Вакальныя нумары ў выкананні спявачкі Петрушэнка стаяць таксама на вельмі нізкім узроўні і нічога цікавага не ўяўляюць.

Совецкі глядач патрабуе большай увагі да сябе. Ён ужо навучыўся адрозніваць сапраўднае мастацтва ад халтуры. На экране, з эстрады, у тэатры ён жадае ўбачыць сапраўдныя творы мастацтва, а ў пачэснай ролі спевакоў, актораў, музыкантаў ён хоча бачыць людзей таленавітых, чэсных, адданых нашай радзіме. Усякім халтуршчыкам, людзям выпадковым, бяздарным, нядобрасумленным не павінна быць месца ў асяроддзі совецкіх артыстаў.

Артысты джаза пад кіраваннем Ігнацьева, аб якім мы гаварылі, павінны гэта запамятаць. Пры настойлівай рабоце над сабой, пры добрасумленных адносінах да сваіх абавязкаў гэты аркестр, у якім ёсць нямала кваліфікаваных выканаўцаў, здолее стаць каштоўнай мастацкай адзінкай.

Н. ЛІН.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г. — 4721.